№ 4 (3949)

16 студзеня 2015 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Íà ïðàñòîð, íà øûðîê³ ðàçëîã
Âûõàäç³, ïîé íàðîä, ãðàìàäîþ...

ßêóá ÊÎËÀÑ

Народная Воля

Да ўвагі!
Õòî õî÷à
íàáûâàöü ãàçåòó
¢ îô³ñå ðýäàêöû³ —
÷àêàåì!

ПАЛІТКУХНЯ

Адказ Аляксандра Лукашэнкі “добразычліўцам”

Людзям недасведчаным магло падацца, што ўчора ў Авальнай зале Палаты прадстаўнікоў адбывалася звычайнае (хоць і пазачарговае) пасяджэнне з удзелам кіраўніка дзяржавы, але на самай справе заявы, якія там рабіліся, маюць, мяркую, цікавы падтэкст.

У любой краіне гэта быў бы грандыёзны скандал, пра які напісалі б усе газеты. У Беларусі тое, што адбылося, выклікала толькі актыўныя каментарыі ў сацыяльных сетках інтэрнэту. Пачалося з таго, што пасол Расіі Аляксандр Сурыкаў у снежні мінулага года дыпламатычна намякнуў: «На дадзены момант беларускі кіраўнік не выказаў жадання зноў балатавацца на пасаду прэзідэнта. І я нешта сумняваюся, што ён пойдзе на выбары. Але калі ўсё-такі пойдзе, то асабіста я, як чалавек, яго падтрымаю».

Няма ніякіх падстаў лічыць, што пасол Сурыкаў – гэта тая асоба, з якой Аляксандр Лукашэнка раіцца наконт таго, ісці яму ці не ісці на выбары. Па крайняй меры ён не першы ў спісе падобных дарадцаў. Але “інфармацыйны ўкід” адбыўся і быў падхоплены ў першую чаргу расійскімі СМІ.

Далей – болей.

На пачатку гэтага года да некаторых беларускіх журналістаў і палітолагаў пачалі звяртацца расійскія калегі з просьбай пракаментаваць звесткі, якія яны быццам атрымалі з крамлёўскіх крыніц. А звесткі такія: Аляксандр Лукашэнка на прэзідэнцкія выбары, маўляў, не пойдзе, кандыдатам у прэзідэнты будзе цяперашні міністр замежных спраў Уладзімір Макей.

Вядомы беларускі палітолаг, уласны карэспандэнт “Народнай Волі” ва Украіне Аляксандр Фядута таксама сутыкнуўся з такой просьбай. Ён атрымаў электронны ліст за подпісам нейкай Паліны Кліменка, нібыта журналісткі расійскага выдання LifeNews, якое апошнім часам спецыялізуецца на самых, так бы мовіць, “гарачых” навінах. «Як вы можаце пракаментаваць сітуацыю адмовы Лукашэнкі ўдзельнічаць у выбарах на карысць Макея?” – запыталася яна.

Фядута нічога каментаваць не стаў, толькі на сваёй старонцы ў інтэрнэце напісаў пра сам факт звароту. Як высветлілася, падобныя звароты былі і да іншых беларускіх палітолагаў і журналістаў. Прычым у некаторых лістах, акрамя інфармацыі пра Макея, сцвярджалася, што прэзідэнцкія выбары пройдуць не восенню, а ўжо вясной. Нібыта так вырашана “ў вузкіх колах” і меркавання Лукашэнкі на гэты конт нават не пыталіся…

“Лукашэнка не ідзе на выбары? Смешна! Напэўна, міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей, які апошнім часам шмат намаганняў прыкладае для нармалізацыі адносін паміж Беларуссю, з аднаго боку, а ЕС і ЗША – з другога, некаму стаў косткай у горле”, – прыкладна так на гэтыя прыхаваныя гульні адрэагавала большасць назіральнікаў і палітолагаў у Мінску.

Хто і што стаіць за ўсёй гэтай кампаніяй? Галоўны рэдактар LifeNews Анатоль Сулейменаў ад усяго адхрысціўся. “У нас Паліна Кліменка не працуе. Нехта спрабуе выкарыстаць Life з мэтай масавага ўкіду”, – паведаміў ён.

Але тэма на гэтым не закрылася.

Не ведаем, якая размова пасля ўсёй гэтай гісторыі адбылася паміж Лукашэнкам і Макеем і ці адбылася ўвогуле, але ўчора няцяжка было здагадацца, што кіраўнік Беларусі шэрагам сваіх заяў адказвае менавіта на гэтую ананімную псіхалагічную атаку.

Першае. Ён пацвердзіў, што выбары пройдуць восенню. “Я ўжо не раз казаў: мы не будзем падстройвацца пад час, кан’юнктуру, абставіны, маўляў, восенню будзе цяжка, вясной – лёгка, таму трэба хутчэй правесці выбары, каб атрымаць больш галасоў”, – заявіў ён.

Другое. Ён папрасіў Расію “не турбавацца”. «Мы ж не абураемся тым, што Расія мэтанакіравана прыкладае каласальныя намаганні для нармалізацыі адносін з Захадам. Вось і вы не абурайцеся. Трэба супакоіцца і нармальна працаваць”, – сказаў Аляксандр Лукашэнка. І дадаў: “Няхай ніхто не напружваецца ні ў нас, ні ў Расіі наконт таго, што Беларусь будзе настойліва ісці да нармалізацыі адносін з ЕС і ЗША”.

Трэцяе. Ён прадэманстраваў адназначнае разуменне таго, што гэтая самая нармалізацыя адносін з Захадам будзе залежаць ад таго, як пройдуць прэзідэнцкія выбары, паведаміўшы, што ЕС і ЗША чакаюць іх вынікаў.

Пра Уладзіміра Макея, праўда, не сказаў ні слова. Але не звольніў – і гэта таксама адказ.

Алена НОВІКАВА.

УЧОРА

Змены ў Савеце Рэспублікі

Прызначаныя кіраўніком Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі Аляксандр Косінец і віцэ-прэм’ерам Наталля Качанава датэрмінова спынілі паўнамоцтвы членаў Савета Рэспублікі пятага склікання. Такое рашэнне было прынята на ўчарашнім пасяджэнні пазачарговай сесіі верхняй палаты беларускага парламента. Прычынай спынення паўнамоцтваў стаў пераход чыноўнікаў на новыя пасады.

У той жа час старшыня Мінгарвыканкама Андрэй Шорац рашэннем сесіі быў уключаны ў склад пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы.

TV-НАВІНЫ

Аверкаву шукаюць замену?

Гледачы заўважылі, што з новага года ў праграмы “Контуры” на канале АНТ новыя вядучыя. Аляксандр Аверкаў, які вёў праграму з лістапада 2002 года, апошні раз у «Контурах» з’явіўся 28 снежня. 4 студзеня праграму вёў ужо Яўген Лашкоўскі, 11 студзеня – Раман Паддубскі.

Прэс-сакратар канала Юлія Дубоўская паведаміла БелаПАН, “што Аляксандр Аверкаў часова не будзе весці праграму тэлеканала АНТ «Контуры». Пры гэтым Аверкаў будзе працягваць весці выпускі «Нашых навін». Паводле слоў Дубоўскай, на праграму «Контуры» спрабуюцца новыя вядучыя. Гэта звязана з тым, што ў тэлеканала ёсць ідэі змен канцэпцыі праграмы.

ПАРАЎНАЕМ…

Нафта таннее, бензін даражэе

Днямі ў Беларусі зноў падаражэў бензін – на 4,7%. Прычым адбылося гэта літаральна адначасова з чарговым падзеннем сусветных коштаў на нафту: 13 студзеня “чорнае золата» рэкордна патаннела, цана за барэль дасягнула ўзроўню мая 2009 года і стала ніжэй за 50 долараў.

Ва ўсіх еўрапейскіх краінах разам з падзеннем коштаў на нафту знізіліся і цэны на аўтазапраўках, што лагічна. У ЗША і ўвогуле 13 студзеня быў устаноўлены рэкорд – 58 цэнтаў за літр паліва. І гэта ў краіне, дзе мінімальны (заўважце – мінімальны!) заробак у месяц складае прыблізна паўтары тысячы долараў. У Францыі і Германіі бензін ад лета патаннеў прыблізна на 10,5%, у Польшчы – на 8,5%.

Даражэе паліва, мабыць, толькі ў Беларусі і яшчэ ў адной-дзвюх краінах. І гэта нягледзячы на тое, што наш урад як быццам забараніў павышаць кошты. У пастанове Саўміна ад 19 снежня «Аб некаторых пытаннях спажывецкага рынку» згадваецца і «Белнафтахім» – канцэрну даручана не дапускаць росту коштаў. Прычым днямі Міністэрства гандлю выступіла з заявай, што тэрмін дзеяння ўрадавай пастановы бестэрміновы, кошты ў краіне і надалей павінны заставацца на ранейшым узроўні. Аднак «Белнафтахім» прадэманстраваў, якая цана гэтым словам… Але гэта, як кажуць, ужо іншая тэма.

Што тычыцца коштаў на аўтамабільнае паліва, то таксама, як і ў Беларусі, на фоне паніжэння цаны на нафту бензін даражэе ў Расіі – краіне, дзе сыравіна для паліва здабываецца. У снежні, праўда, калі Уладзімір Пуцін раскрытыкаваў нафтавыя кампаніі, цэны на бензін у Расіі зменшыліся, але днямі зноў пайшлі ўверх. А калі параўноўваць кошты на бензін на расійскіх АЗС у чэрвені і снежні, то, як і ў нас, яны падраслі: АІ-95 у чэрвені каштаваў 33,74 расійскага рубля, у снежні мінімальны кошт складаў – 35,9 рубля.

У Беларусі за гэты перыяд бензін падаражэў на 25,4 працэнта. У чэрвені літр 95-га бензіну каштаваў 9500 рублёў, цяпер – 11.900. Пры гэтым сярэдні заробак у Беларусі застаўся практычна на тым жа ўзроўні, нават некалькі знізіўся – у ліпені, паводле афіцыйнай статыстыкі, намінальная налічаная сярэднямесячная зарплата складала 6,455 млн рублёў, у лістападзе – 6,194 млн (дадзеных за снежань няма, але ў снежні не была павялічана і тарыфная стаўка І разраду, ад якой і залежаць зарплаты працаўнікоў).

Марыя ЭЙСМАНТ.

Як мяняліся цэны на запраўчных станцыях Еўропы?

Краіна	Цана за літр АІ-95 у чэрвені 2014 г. (у еўра)	Цана за літр АІ-95 у снежні 2014 г. (у еўра)	Падзенне кошту ў працэнтах
Францыя	1,54	1,38	10,5%
Германія	1,57	1,38	10,4%
Бельгія	1,68	1,52	9,5%
Фінляндыя	1,64	1,48	9,5%
Латвія	1,3	1,18	9,2%
Эстонія	1,32	1,20	9%
Польшча	1,25	1,14	8,5%
Казахстан	0,53 (літр АІ-92)	0,47 (літр АІ-92)	11%

ДАРЭЧЫ

Нафта ў 2014 годзе патаннела амаль удвая

Як мянялася цана барэля нафты маркі Brent (менавіта яна з’яўляецца асновай для цэнаўтварэння каля 40% усіх сусветных гатункаў нафты, у тым ліку і той, што здабываецца ў Расіі). Цэны ў доларах ЗША.

ДИПКУРЬЕР

Визы в Беларусь подешевели

«Белорусской стороной было принято решение о снижении сумм консульских сборов, взимаемых с граждан США и подданных Великобритании, до уровня, который действует в отношении граждан большинства других стран и составляет за однократную визу 60 евро», – сообщил пресс-секретарь МИД Дмитрий Мирончик.

Он подчеркнул, что данный шаг является «частью комплекса решений, направленных на либерализацию визовой политики Республики Беларусь, которые вступили в силу в январе 2015 года». Представитель МИД добавил, что эти решения касаются не только удешевления виз, но и других мер. В частности, что касается США и Великобритании, заявители из этих стран, не достигшие 14 лет, будут освобождены от консульского сбора.

Как отмечает tut.by, сайт Посольства Беларуси в США так описывает решение белорусских властей: «Это одностороннее политическое решение – сознательный жест доброй воли со стороны руководства Беларуси, нацеленный на сближение народов Беларуси и США, снятие барьеров для контактов между людьми, развитие туризма. Это решение ясно демонстрирует открытость нашей страны сотрудничеству с США в различных сферах».

По новым расценкам, размещенным на сайте посольства, белорусские визы для детей до 14 лет, как и было сказано, станут бесплатными (ранее их стоимость составляла 160 долларов). Однократная транзитная виза будет стоить 25 долларов вместо 160, однократная виза для краткосрочных визитов – 75 долларов вместо 160. Однако по новым правилам возрастет стоимость многократных долгосрочных виз – со 160 до 180 долларов.

У НУМАР!

“А мы тут што, для мэблі стаім?”

Учора карэспандэнт “Народнай Волі” адправіўся ў рэйд па сталічных банках і пунктах абмену валюты, каб высветліць, ці з’явілася там валюта, ці знік ажыятажны попыт на іншаземныя грошы з боку насельніцтва. Долар, як вядома, патаннеў на 50 рублёў, афіцыйны курс складае 14.960 рублёў.

Першы паверх ГУМа. Абменны пункт “Белінвестбанка”. Курсы наступныя: продаж долара ЗША – 15.310, еўра – 18.055. Валюты на момант майго прыбыцця не было. Затое стаяла чарга з васьмі чалавек. “Мужчына, вы здаваць? Тады праходзьце. Калі не – займайце чаргу, будзеце дзявятым”, – звяртаецца да мяне пенсіянерка. На пытанне, ці ёсць шанц дастаяцца, вопытная ў гэтым сэнсе жанчына (як высветлілася з размовы, тусуецца яна тут ужо не першы дзень) адказвае: “Не факт. Асабіста мне трэба набыць 2000 долараў, не хапае для таго, каб набыць кватэру. Учора ўдалося ўхапіць толькі 400 “зялёных”, сёння стаю тут з адкрыцця, пакуль справа ніяк не рухаецца. Бліжэй да вечара, калі валюту не куплю, “на вахту” заступіць дачка”.

Побач з ГУМам – універсам “Цэнтральны”. Тут абменны пункт “Абсалютбанка”. Курсы: долары прадаюць за 15.310, еўра – за 18.060. Накіроўваюся да акенца. У спіну ляціць вокрык: “А мы тут што, для мэблі стаім?” Гэта гневаецца мужчына гадоў 45, адчуваецца, што пытанне для его балючае. Калі зразумеў, што я не збіраюся купляць валюту, заспакоена выдыхнуў і дадаў: “Стаю хвілін 40. Хоць бы 50 еўра купіць! Днямі выязджаю за мяжу, бегаю па абменніках, купляю, дзе што ёсць. Але апошнімі днямі не шанцуе: людзі валюту мала здаюць, а банкі са сховішчаў у касы нічога не завозяць”.

Не аказалася замежных грошай і ў аддзяленні “Беларуска-швейцарскага банка”, што на плошчы Свабоды, 4, не было іх і ў аддзяленні “Беларусбанка” на вуліцы Леніна…

Напрыканцы рэйду вырашаю праверыць чуткі пра тое, што на чыгуначным вакзале Мінска ў абменніках валюта ёсць – за кошт таго, што яе здаюць госці сталіцы. І гэта праўда, але попыт усё адно перавышае прапанову.

У чарзе разгаварыўся з жанчынай. Вераніка Паўлаўна распавяла сумную, але даволі характэрную для сучасных беларускіх рэалій гісторыю: “Некалі даўно я зрабіла ўклад у беларускіх рублях у адным з банкаў. Раз у месяц-два папаўняла яго часткай уласнай зарплаты. У выніку сума сабралася прыстойная – 35 мільёнаў рублёў. Яшчэ на пачатку снежня яна была эквівалентна 3200 доларам. Перад Новым годам я зняла 10 мільёнаў – на падарункі родным. На пачатку студзеня, калі беларускі рубель пачаў “танцаваць”, забрала астатнія грошы. Яшчэ на 10 мільёнаў удалося купіць валюты на пачатку гэтага месяца, калі быў 30-працэнтны збор. Астатнюю суму вырашыла таксама канвертаваць у цвёрдую валюту. Не трэба быць эканамістам, каб зразумець: людзі становяцца бяднейшымі… Асабіста я згубіла вельмі шмат. Сама вінавата. Зараз у мяне няма веры беларускаму рублю. Таму заўтра я зноўку прыйду на вакзал у надзеі купіць валюту…”

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ПРАМЫЯ ЛІНІІ

У суботу яны будуць чакаць вашых званкоў…

Такога, здаецца, яшчэ не было. У адзін дзень (17 студзеня) і ў адзін час (з 9.00 да 12.00) кіраўнікі ўсіх абласцей і горада Мінска будуць адказваць на званкі грамадзян. Мяркуецца, што такім чынам удасца павысіць эфектыўнасць работы са зваротамі фізічных і юрыдычных асоб, максімальна выкараніць факты бюракратызму і цяганіны, тэрмінова прыняць рашэнні па найбольш вострых праблемах людзей.

Дарэчы, у гэты ж дзень, у суботу, паралельна прамыя тэлефонныя лініі будуць праводзіць старшыні гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў, іх намеснікі і кіраўнікі спраў. Пры неабходнасці абласное начальства можа мець з імі неадкладную сувязь і даваць канкрэтныя даручэнні.

Калі верыць афіцыйнаму паведамленню, то такія прамыя лініі будуць праводзіцца кожную суботу. Тэлефануйце, звяртайцеся з хвалюючымі пытаннямі, цікавымі прапановамі, арыгінальнымі ідэямі.

Графік прамых тэлефонных ліній на 17 студзеня 2015 года

БРЭСЦКАЯ ВОБЛАСЦЬ
Ліс Анатолій Васільевіч – старшыня аблвыканкама
(8-0162) 21-31-21

ВІЦЕБСКАЯ ВОБЛАСЦЬ
Дзіулін Анатолій Уладзіміравіч – намеснік старшыні аблвыканкама
(8-0212) 20-42-60

ГОМЕЛЬСКАЯ ВОБЛАСЦЬ
Дворнік Уладзімір Андрэевіч – старшыня аблвыканкама
(8-0232) 74-41-23

ГРОДЗЕНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ
Краўцоў Уладзімір Васільевіч – старшыня аблвыканкама
(8-0152) 73-56-44

МАГІЛЁЎСКАЯ ВОБЛАСЦЬ
Даманеўскі Уладзімір Віктаравіч – старшыня аблвыканкама
(8-0222) 50-18-69

МІНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ
Шапіра Сямён Барысавіч – старшыня аблвыканкама
(8-017) 500-41-60

ГОРАД МІНСК
Шорац Андрэй Віктаравіч – старшыня гарвыканкама
(8-017) 222-44-44

ПАД ГРАДУСАМ...

Не хавайце парасоны

У Беларусі працягвае захоўвацца цёплае надвор’е, якое адпавядае сакавіку, але не студзеню.

Сёння ў начныя гадзіны пераважна без ападкаў, раніцай і ўдзень у паўночна-заходніх раёнах краіны прагназуецца мокры снег і дождж. Тэмпература ўначы будзе вагацца ад 0 да мінус 6 градусаў, у дзённыя гадзіны прагназуецца ад 0 да 6 градусаў цяпла. Такі ж характар надвор’я чакаецца і ў суботу. У нядзелю, 18 студзеня, надвор’е абумовяць больш актыўныя атмасферныя франты, якія змяшчаюцца з паўднёвага захаду Еўропы, і ў выніку гэтага на большай частцы нашай краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі (мокры снег, дождж). Ноччу і раніцай месцамі туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы -2...+3°, днём 0...+6°.

СЛУЧАЙ

Раз в десять лет…

Такое случается, как говорится, раз в десять лет. В минувшем номере «Народной Воли» из-за технического сбоя две заметки – «Интерпол объявил Януковича в розыск» и «На реконструкцию дорог требуется около 90 триллионов рублей» – опубликованы дважды, на разных страницах. Понятно, здесь есть и человеческий фактор, но нельзя сбрасывать со счетов, что сегодня технологическая цепочка настолько тонкая, что она может порваться в таком месте, о котором даже не подумаешь.

Приносим свои извинения читателям.

Редакция газеты «Народная Воля».

Народная Воля
http://www.nv-online.info
16 СТУДЗЕНЯ 2015 ã.

ЧУЛІ?

У Вільнюс – з ветрыкам

Беларуская чыгунка атрымала 160 тысяч еўра міжнароднай тэхнічнай дапамогі

Тэхнічная дапамога прадастаўлена Еўрасаюзам для ўстаноўкі тэрміналаў стандарту GSM-R на лакаматывы, якія курсіруюць па маршруце Мінск–Вільнюс, паведамляе прэс-цэнтр БЧ.

Плануецца, што ў першым паўгоддзі 2015-га тэрміналы, якія падтрымліваюць стандарт радыёсувязі GSM-R, які дзейнічае ў краінах ЕС, будуць устаноўлены на 34 лакаматывы. Гэта забяспечыць якасную няспынную сувязь машыністаў з цягніковымі дыспетчарамі і дзяжурнымі па станцыях на тэрыторыі Літвы, павысіць бяспеку пасажырскіх перавозак.

Яшчэ ў 2010 годзе беларускія і літоўскія чыгуначнікі пачалі рэалізацыю сумеснага праекта па арганізацыі хуткасных пасажырскіх зносін паміж Мінскам і Вільнюсам. У 2011 годзе быў рэалізаваны першы этап гэтага праекта, што скараціла час у шляху паміж дзвюма сталіцамі з 4 да 3 гадзін. Вынікам другога этапу стала скарачэнне з 1 чэрвеня 2013 года часу руху цягнікоў паміж Мінскам і Вільнюсам да 2,5 гадзіны. Зараз рэалізуюцца мерапрыемствы трэцяга этапу праекта.

Кірыл БУБНОЎ.

ШТО ХВАЛЮЕ...

Валерый КАВАЛЬКОЎ,
намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:

«Пераразліку пенсій не будзе»

У сувязі з дэвальвацыяй нацыянальнай валюты абясцэніліся і пенсіі. Сёння сярэдняя працоўная пенсія па ўзросце складае 2,734 млн рублёў. Паводле афіцыйнага курса Нацбанка гэта ўсяго толькі 182 долары.

Ці праіндэксуюць пенсіі ў сувязі з паслабленнем рубля? Такое пытанне было зададзена намесніку міністра працы і сацыяльнай абароны Валерыю Кавалькову, калі ён праводзіў “прамую лінію” на сайце свайго ведамства.

Чыноўнік патлумачыў, што пенсіі ў Беларусі выплачваюцца за кошт адлічэнняў з заробкаў, якія паступаюць у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва. Заробкі, як вядома, не індэксаваліся.

– А калі паступленні ў Фонд не павялічыліся, у сувязі з чым мы можам плаціць пенсію ў большым памеры? – растлумачыў чыноўнік. – Пераразліку пенсій у сувязі з дэвальвацыяй беларускага рубля не будзе, таму што ў нас валюта – беларускі рубель, у нас цэны ў беларускіх рублях, і наша ўнутраная прывязка да долара – гэта наша асабістае перакананне. Можна перавесці пенсію на расійскі рубель, і атрымаецца, што пенсіянер стаў багацейшы, таму што расійскі рубель быў дэвальваваны яшчэ больш.

ФАКТ

Без уліку дэнамінацый курс долара ЗША дасягнуў 150 мільёнаў беларускіх рублёў

Сёння афіцыйны курс долара крыху патаннеў. Але ўчора, 15 студзеня, дасягнуў адзнакі 15.010 рублёў, што з’яўляецца новым гістарычным максімумам. Без уліку дэнамінацый 1994 і 2000 гадоў курс склаў 150 мільёнаў 100 тысяч рублёў.

SOS!

Мать Николая Дедка просит МВД прекратить преследование ее сына

Мать политзаключенного Николая Дедка Валентина Николаевна обратилась с открытым письмом в Министерство внутренних дел Беларуси. Приводим его текст без изменений.

Открытое письмо

Я, Дедок Валентина Николаевна, мать политического заключенного Дедка Николая, содержащегося в тюрьме №4 г.Могилева, получила ответ на свое обращение, проверку по которому проводил первый заместитель начальника управления ДИН МВД по Могилевской области Толкачев Ю.В. Сообщаю, что ни на один из поставленных мной вопросов не получено адекватного ответа. Ответов вообще не было. Самая главная фраза в ответе звучит так: «Ваш сын не имеет претензий». Может, у моего сына их и нет по известным всем вам причинам, но они есть у меня. И чем дальше, тем больше. На сайте ДИН МВД я ознакомилась с функциями этой структуры. И грош цена этому ведомству, если моего сына, нормального члена общества, более чем за 4 года изнурительной отсидки превратили в «злостного хулигана», в «лицо, склонное к захвату заложников». Это как надо стараться! Вас содержит общество, платя налоги, а свои функции ведомство упорно не выполняет. Мой сын за эти годы милостью ведомства поменял несколько мест лишения свободы: изолятор на Окрестина, тюрьма на Володарского в Минске, тюрьма в Жодино, Республиканская больница МВД, колонии №15 (Могилев) и №17 (Шклов), медсанчасти в них, так как его здоровье оставляет желать лучшего. А чего стоят этапы! Сейчас сын больше года содержится в Тюрьме №4. Мое мнение, что это чистый геноцид. Сейчас я опасаюсь за его здоровье и жизнь, так как давление на него усилилось. За короткий промежуток времени его переводили четырежды (!) из камеры в камеру из-за конфликтов в камерах. Сын никогда не был конфликтным, всегда и везде умел находить общий язык с окружающими, ведь мы до сих пор получаем письма от людей, с которыми он сидел, общаемся с их родственниками. О нем прекрасно отзывались отбывавшие вместе с ним сроки политические заключенные Статкевич, Бондаренко, Киркевич и многие другие. Вывод у меня один – на него оказывается воздействие любыми средствами, с целью подавления его личности. Все люди понимают, к чему такое давление, не дай Бог, может привести!

Для ведомства политические заключенные – это враги, в то время как настоящие преступники и криминал не вызывает проблем, они для власти «социально близкие», как говорил один «великий политик». Многие политические заключенные, правозащитники громогласно заявляют о возросшем давлении на политических. Почему вы этого не слышите? Вы считаете, что мимо вас «пронесет», не будет ответственности за все содеянное? В учреждениях унижается честь, достоинство личности, осужденные содержатся порой в нечеловеческих условия. Зачастую используются сокамерники для оказания давления на политических. Всем известно о широком использовании администрациями белорусских пенитенциарных учреждений так называемых «статусных» отношений между заключенными в качестве инструмента давления на инакомыслящих заключенных. Эта тема требует отдельных проверок. Сейчас моего сына обвиняют в нарушении формы одежды. И за это ему новый срок?! Еще Верховный Суд Союза ССР указывал на то, что нарушение формы одежды не может быть основанием для уголовного дела за неповиновение администрации или нарушение режима отбывания наказания. А если внезапно зайти в любое учреждение и посмотреть, сколько заключенных будет в форме, соответствующей правилам? Налицо избирательный подход именно к политическим заключенным.

По выходу из колонии в Горках Василий Парфенков дал пресс-конференцию, на которой осветил детали отношения к политзаключенным и, в частности, поиски пыли, придирки к форме одежды и оскорбления политзаключенных, включая угрозы. О трудовых и производственных отношениях в колонии, соблюдении правил охраны труда и промышленной безопасности мой сын писал заявление в ДИН МВД. Мало того, что его заявление в ДИН вообще не дошло, так еще за это сына на 6 месяцев посадили в ПКТ (помещение камерного типа, тюрьма в тюрьме). И кто в этом виноват и как виновники наказаны?

Прошу ответить, кто и по какой причине организует переводы по тюрьмам и колониям моего сына Дедка Николая и «состряпал» на него новое уголовное дело. Я хочу знать фамилии и должности тех, кто этим занимается, и зачем это нужно. Я все эти годы терпела эти издевательства, надеясь, что все это в конце концов прекратится по окончании срока наказания 3 марта 2015 года. Но сейчас циничным образом, со ссылкой на непонятные статьи и неопределенные основания, губится жизнь и здоровье не только моего сына, но и мое. Я этого не могу и не имею права оставить без внимания, буду кричать об этом на весь мир. Зная нашу вертикально-бюрократическую систему, я понимаю, что в отношении политических заключенных администрации колоний и тюрем все делают по указке «сверху», однако мы призываем их всех помнить о совести и человечности, об ответственности перед людьми и Богом!

От редакции

Поскольку Валентина Николаевна Дедок избрала открыто-публичную форму обращения, то, надеемся, и руководство Министерства внутренних дел воспользуется страницами «Народной Воли».

ДАВЕДАЧНАЕ БЮРО СПАЖЫЎЦОЎ



На пытанні чытачоў адказвае старшыня Пухавіцкай раённай арганізацыі ГА «Беларускае таварыства абароны спажыўцоў» **Васіль ВАЛАСЮК.**

Калі майстар змяняе кошт

Перастала працаваць мікрахвалевая печка. Выклікалі па аб’яве майстра, індывідуальнага прадпрымальніка. Той прыйшоў і паведаміў, што неабходна замена дэталі, якая каштуе 370 тысяч рублёў. Паабяцаў зрабіць замену праз некалькі дзён. Але праз некалькі дзён заявіў, што кошт дэталі вырас у сувязі з ростам курса долара. Маўляў, дэталь імпартная. Ці павінны мы плаціць больш?

Сцяпан БУДАНАЎ, Мінск.

– Не павінны. Калі ёсць дамова выканання работы па старой цане, заяўляйце прэтэнзію на выкананне гэтай дамовы ў сямідзённы тэрмін.

Зламаўся смартфон, гарантыя на які скончылася

У мяне зламаўся смартфон. Гарантыя скончылася, у дакументах пазначаны тэрмін службы 3 гады (але 3 гады яшчэ не прайшлі). Ці магу я вярнуць грошы альбо запатрабаваць замены тэлефона? Што рабіць?

Канстанцін БЕЛЬСКІ, г.Маладзечна.

– У гэтым выпадку права на замену тавару належыць спажыўцу. Звярніцеся да арт.20 Закона аб абароне правоў спажыўцоў.

Колькі часу могуць рамантаваць відэарэгістратар без гарантыі?

Планую аддаць у рамонт відэарэгістратар без гарантыі. Колькі часу яго могуць рамантаваць?

Станіслаў ЛЯНКЕВІЧ, г.Ліда.

– Рамонт павінен быць зроблены на працягу 14 дзён.

Зламаліся навушнікі ад тэлефона

Ці адносяцца навушнікі для тэлефона да тэхнічна складаных тавараў бытавога прызначэння? І ці можна вярнуць грошы за іх на працягу 14 дзён, калі навушнікі неналежнай якасці?

Аляксандр ГАДЛЕЎСКІ, г.Пінск.

– Калі навушнікі ідуць у камплекце з тэлефонам, замена ідзе таксама разам з тэлефонам. Калі набылі асобна ў рознічнай сетцы, то можаце іх абмяняць ці вярнуць назад у магазін.

Купіла футра, але яно не падышло па фасоне

Набыла не так даўно футра, але яно не падышло мне па фасоне. Купіла ў крэдыт, але футра яшчэ не апранала. Ці магу вярнуць назад?

Святлана, Мінск.

– Можаце, але на працягу 14 дзён.

Абавязкі сэрвіснага цэнтра

Ці павінен сэрвісны цэнтр паведаміць мне аб выкананні заказу па рамонце камп’ютара?

Віктар КАРОБКІН, Віцебск.

– Так. Спасылайцеся на арт.5 Закона аб абароне правоў спажыўцоў, у якім сказана аб поўным інфармаванні спажыўца.

Ноўтбук два разы быў у гарантыйным рамонце

Калі ноўтбук два разы быў у гарантыйным рамонце, ці магу я абмяняць яго (у тым жа магазіне) на ноўтбук іншай мадэлі па тым жа кошце? Няспраўнасць была адна і тая ж…

Сяргей ЖУРАЎКОЎ, г.Асіповічы.

– Можна пры наяўнасці даведкі ад майстэрні, што ёсць істотны недахоп, які немагчыма ліквідаваць.

Туфлі фарбуюць ногі

Набыла туфлі, а яны фарбуюць ногі. Што мне зараз рабіць?

Валянціна, г.Шчучын.

– Гэта вытворчы недахоп, а значыць, туфлі можна замяніць.

Не прадаюць тавар, бо ў касіра няма рэшты

У чые абавязкі ўваходзіць забяспечыць кліента рэштай? І як правільна сябе паводзіць, калі не адпускаюць тавар з нагоды таго, што ў касіра, маўляў, няма рэшты?

Алена ГАЛІЦКАЯ, г.Лепель.

– Касіры павінны быць забяспечаны наяўнымі грашыма перад пачаткам работы, таму тавар вам павінны прадаць абавязкова. У адваротным выпадку звярніцеся да адміністратара альбо запатрабуйце кнігу скаргаў і прапаноў. Думаю, вашу праблему пасля гэтага вырашаць умомант.

У электрачайніку не спадабалася вечка

Купіў у магазіне электрачайнік. Дома высветліў, што канструкцыя вечкі нязручная ў карыстанні. Дрэнна адчыняецца – яе пры гэтым можна зламаць. Прыехаў у магазін абмяняць тавар, але такога чайніка ўжо не было. Прадстаўнік магазіна адмовіўся вяртаць грошы, прапануючы абмяняць на іншы тавар. А іншы мне не патрэбны. На чыім баку праўда?

Аляксей ВЯЛІЧКА, Віцебск.

– На вашым, бо права выбару тавару належыць спажыўцу, а не прадаўцу.

Падрыхтаваў Алесь СВЯТЛАНІЧ.

СИТУАЦИЯ

Почему вместо французской прививки нашим детям делают российскую?

В «Народную Волю» позвонила молодая мама Дарья Сакович и пожаловалась: «Подошло время делать ребенку прививку от столбняка и коклюша, и участковый терапевт посоветовала отложить время вакцинации: мол, у ребенка случается пищевая аллергия. Врач объяснила, что еще недавно Минздрав закупал французскую вакцину «Пентаксим», это так называемая комбинированная вакцина, которая обеспечивает выработку иммунитета сразу от 5 инфекций: дифтерии, коклюша, столбняка, а также полиомиелита и инфекций, которые провоцируют развитие менингита, пневмонии и других заболеваний. А сейчас французскую вакцину не закупают, и нашим деткам колют российскую. Но поскольку она несколько другого качества, сроки вакцинации детям переносят на более поздний возраст. Более того, даже в частных медцентрах за деньги нельзя сделать прививку вакциной «Пентаксим» – ее белорусские поставщики отказались завозить».

«Разберитесь, пожалуйста, почему вместо французской прививки нашим детям делают российскую, – просила молодая мамочка. – Неужели у государства нет денег на качественную вакцину для детей?»

Как оказалось, никакого экономического умысла – заменить дорогую французскую на более дешевую российскую вакцину – у чиновников от Минздрава нет и не было. В ведомстве нам пояснили, что поставщиком действительно был сорван план поставок вакцины «Пентаксим» и, чтобы не срывать Национальный календарь прививок (а детям с 3 месяцев проводятся профилактические прививки против дифтерии, столбняка, коклюша, полиомиелита), было принято решение заменить эту вакцину на две – российскую АКДС (против дифтерии, столбняка, коклюша) и «Имовакс полио» (против полиомиелита).

В свою очередь поставщики лекарственных средств говорят, что до конца года «Пентаксим» в Беларусь завозиться не будет.

– Возникли проблемы у компании-изготовителя, – пояснили нам в компании «Медвакс». – Насколько нам известно, нет определенного штамма – ее не могут изготовить. Аналогичная ситуация с «Пентаксимом» сложилась и в странах Балтии, и в других странах европейского региона – туда она тоже не завозится. Так что тут нашей вины нет.

К слову, врачи говорят, что опасения родителей по поводу того, что вакцинация российской АКДС плохо переносится детьми и сопровождается тяжелыми последствиями, не совсем обоснованы.

– АКДС действительно относится к группе самых реактивных вакцин, потому что там присутствует коклюшный и столбнячный компоненты, – говорит педиатр с 20-летним стажем Ирина Семенова. – Россияне дают статистику, что в 60% случаев у детей могут возникать побочные реакции – повышается температура, беспокоит место укола. Конечно, в таком случае деток надо немедленно показать врачу. Но при вакцинации допускается повышение температуры в течение трех дней. Хочу подчеркнуть, что реакция может быть на любую вакцину, потому что в организм вводится чужеродный белок и организм вырабатывает иммунитет к конкретному заболеванию. Поэтому любую прививку обязательно нужно делать только тогда, когда ребенок здоров.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

ПА-ЗА ГУЛЬНЁЙ

“Нёман” – у фінансавай яме

Да 1 лютага футбольны клуб павінен знайсці 6,5 мільярда рублёў, а ўвогуле яго даўгі складаюць больш за 15 мільярдаў.

Футбольны “Нёман” патрапіў у даўгавую яму. Праблемы з грашыма прывялі да таго, што з каманды збеглі амаль усе вядучыя ігракі. Да 1 лютага клуб павінен разлічыцца з запазычанасцямі па заробках, прэміяльных і выплатах на адпачынак, бо інакш каманду, якая, дарэчы, у мінулым сезоне выступала ў еўракубках, проста не дапусцяць да ўдзелу ў чэмпіянаце краіны.

“Выдаткі клуба “Нёман” да канца 2014 года ў паўтара раза перавысілі плануемы бюджэт, – абураўся ў прэсе старшыня Гродзенскай абласной федэрацыі футбола Віктар МАРОЗАЎ. – Чаму? Па-першае, беспадстаўна завышаліся заробкі футбалістаў. Па-другое, было бяздумнае расходаванне грошай (напрыклад, два перадсезонні зборы ў Турцыі чаканага выніку не прынеслі). Па-трэцяе, праводзілася слабая селекцыйная праца. І самае галоўнае – няўменне ці нежаданне самім зарабляць грошы. Клубу прапаноўвалі арганізаваць сетку аўтамыек у Гродне, стварыць вытворчасць па разліве вады...”.

Складанае становішча, у якое патрапіў клуб, стала нагодай для сустрэчы гродзенскіх чыноўнікаў з кіраўніцтвам “Нёмана” і галоўным трэнерам каманды.

“Наколькі вядома, вырашэннем праблем даручана займацца старшыні мясцовага гарвыканкама Мечыславу Гою, – кажа намеснік кіраўніка Гродзенскай гарадской федэрацыі футбола Васіль САВІЧ. – У бліжэйшы час з пазыкамі абяцаюць разлічыцца”.

– Лёд крануўся, – аптымістычна распавёў “Народнай Волі” генеральны дырэктар ФК “Нёман” Сяргей САХАРЭВІЧ. – Днямі мы заплацілі футбалістам заробак за кастрычнік, пачынаем з імі разлічвацца па пазыках. Да канца студзеня, спадзяюся, з ігракамі разлічымся.

– Ведаю, што некаторыя футбалісты зараз судзяцца з клубам з-за сваіх заробкаў…

– Так, падалі ў суд, але ж, паўтаруся, выплаты ўжо пачаліся. Я ўпэўнены, што ўсё нармалізуецца.

– Старшыня абласной федэрацыі футбола абураўся высокімі заробкамі футбалістаў. Якія яны ў “Нёмане”?

– Якія ж яны высокія? Сярэдні заробак па клубе – 26–28 мільёнаў, прыкладна такі ж, як і ў астатніх клубах першай васьмёркі чэмпіянату. Іншая справа, што кіраўніку федэрацыі, напэўна, не спадабаўся вынік каманды ў першынстве.

– Вы пакуль яшчэ на сваёй пасадзе? А то чуткі розныя хадзілі…

– У мяне кантракт да 23 лютага. Пабачым…

Алесь СІВЫ.

ЗА РУЛЕМ

Какие автомобили будут покупать в Беларуси в 2015 году?



Падение российского рубля, потянувшего за собой белорусский, а также массовые распродажи в российских шоу-румах, устроенные под конец ушедшего года, изменят отечественный авторынок. На какие машины хватит денег в 2015 году, а какие перестанут покупать? На эти вопросы ответил председатель правления Белорусской автомобильной ассоциации (БАА), директор импортера VW в Беларуси «Атлант-М Фарцойгхандель» Сергей Михневич.

Обвал цен на нефть, санкции против России и ослабление российской национальной валюты отразились на странах-соседках по Таможенному союзу. Представители бизнеса Беларуси и Казахстана констатируют ухудшение по всем сегментам. Не стали исключением и автомобили.

В 2014 году в Беларусь ввезено около 50 тысяч новых машин, большинство – из России. Это рекорд, который сложно назвать заслугой дилеров: половина машин ввезена гражданами Беларуси самостоятельно.

«Такого еще не было, - комментирует Михневич итоги продаж-2014. – Объем серого ввоза сравним с количеством официально проданных в стране автомобилей – 25 тысяч. Это катастрофа и для автобизнеса, и для бюджета. Если покупка автомобиля физлицом совершена в шоу-руме другой страны, все налоги достаются ей, в то время как белорусский дилер отдает государству порядка 30% выручки».

Рост продаж новых автомобилей спровоцирован девальвацией российского рубля: в конце прошлого года ценники на товар в российских магазинах замерли примерно на месяц. Рубль падал каждый день, автомобили дешевели буквально на глазах, не воспользоваться такой ситуацией было невозможно. Только за последний квартал 2014 года физлица привезли из России около 15 тысяч новых машин – некоторое время назад отечественные дилеры продавали столько за год!

В основном сограждане ехали за автомобилями бюджетного класса: VW Polo Sedan, Hyundai Accent, KIA Rio. Однако, как подчеркнули в ГАИ, средняя стоимость каждого автомобиля составила порядка 20 тысяч долларов. Это значит, что востребованы были и дорогие машины: кризис позволял сэкономить на премиум-сегменте до 30 тысяч долларов.

«Понимая, что в новом году сэкономить уже не получится, машины покупали те, кто планировал приобретение несколько позже, – напоминает Михневич. – Многие из тех, кто собирался прийти в салон в 2015 году, уже потратили деньги. А значит, продажи в автосалонах Беларуси упадут».

Покупать будут меньше – продавать больше. Как оказалось, владельцами новых машин, собранных в России, стали лица, денежные средства которых еще недавно позволяли рассчитывать только на «бэушку». Только сев за руль нового автомобиля, многие посчитали будущие расходы. Сергей Михневич убежден, что современную технику можно обслужить только на дорогом оборудовании, которым не располагают гаражные СТО, поэтому уверен: часть покупателей выставит приобретенную машину на продажу.



«Новые автомобили российской сборки, которые будут предлагаться к продаже не в салоне, а на авторынках в Малиновке и Ждановичах, – такой может стать особенность этого года, – говорит Михневич. – Это немедленно повлияет на работу дилеров, у которых прямо под носом появится еще один конкурент».

Но главная угроза белорусским дилерам не на стихийном авторынке. Девальвация в стране-соседке продолжается, а значит, новые машины скоро могут опять подешеветь. Даже сегодня новые цены на машины made in Russia формируются несоразмерно новому курсу рубля.

«Несколько дней назад белорусский дилер VW получил новые цены на автомобили и начал продажи, – говорит Михневич. – Зная о ценниках, заявляю: в долларовом эквиваленте автомобили подешевели. Российский рубль девальвирован на 100%, а цены поднялись всего на 40%».

И это не предел. По прогнозам аналитиков, соотношение доллара к российскому рублю в скором времени может достигнуть соотношения 1:75. Товары, сделанные в России, опять подешевеют. А значит, в феврале-марте у сограждан может появиться возможность поехать за автомобилем в Россию.

Недоумеваем: неужели российские производители готовы терять доход, отпуская автомобили по более низкой, чем могут поставить, цене?

«Это так, – соглашается Михневич. – Производителей в России много, у каждого сложился свой рынок, терять который не хочется. Поверьте, заводу выгодней работать с мизерной прибылью, нежели поднять цены и терять покупателей или остановить производство, ожидая стабилизации национальной валюты. Куда проще торговать автомобилями, надеясь на будущую прибыль от продажи запчастей и сервисного обслуживания».

Удар придется и по борисовскому заводу «БелДжи», выпускающему автомобили Geely. До сих пор эти белорусско-китайские машины активно покупали таксисты, компании и физлица. По результатам продаж-2014, бренд занял 9-е место среди легковых автомобилей (продано более 2,2 тыс. Geely), опередив такие известные марки, как Chevrolet, Mitsubishi, Mazda, Audi, Ford. Нынешние его перспективы туманны.

Дело в том, что у Geely едва ли не нулевая локализация: все детали, из которых собирают автомобили, приходится покупать в Китае. А это значит, что стоимость Geely увеличилась. Вопрос, какой автомобиль выберут сограждане – VW Polo Sedan российской сборки за 12 тысяч долларов или Geely SC7 за 14 тысяч долларов, можно назвать риторическим.

По мнению собеседника, ситуация, из-за которой страдают белорусские предприятия, во многом спровоцирована особенностями условий хозяйствования.

«Правительства России и Казахстана заботятся о собственных игроках бизнеса, – говорит Михневич, – в то время как наши чиновники действуют во вред, не поддерживая ни производителя, ни продавца. В Казахстане введен НДС на ввозимые автомобили для физлиц, Россия запретила ввозить машины ниже экологического класса Евро-5. А у нас физлицо может ввезти хоть Евро-0. Продавцам же, несмотря на девальвацию, запрещено увеличивать цены выше установленных 18 декабря 2014 года. Положение более чем странное: запрещая поднимать цены, государство снова увеличило стоимость бензина».

Рассчитывая, что граждане не перестанут пользоваться автомобилями, государство сохраняет спокойствие. По крайней мере, до снижения продаж Geely и налоговых поступлений от игроков автобизнеса. Впрочем, нас, будущих клиентов российских салонов и рынка «Ждановичи», это уже не особо волнует.

Елена АНКУДО.

ЛІЧБА ДНЯ

118 тысяч 720 еўра

Столькі "каштаваў" у мінулым годзе "Славянскаму базару ў Віцебску" Піліп Кіркораў і ягоны калектыў.

Паводле дадзеных, апублікаваных на афіцыйным сайце па дзяржаўных закупках, арганізатарамі і плацельшчыкамі выступілі ЦУ «Цэнтр культуры "Віцебск" і Міністэрства культуры Беларусі.

Як вядома, летась на "Славянскім базары" Кіркораў выступіў з шоу «ДРУGOY», а таксама браў удзел ва ўрачыстым адкрыцці фестывалю.

ПЛАНЫ

Пакуль сакрэт

Дзяржаўны камітэт па маёмасці Беларусі сфарміраваў пералік з 57 акцыянерных таварыстваў, якія часткова ці поўнасцю будуць прыватызаваны. Па задумцы ўлад, продаж акцый павінен прынесці казне ў 2015 годзе не менш за 850 мільёнаў долараў.

Між тым прадпрыемствы, якія трапяць у прыватызацыйны пералік, стануць вядомыя толькі ў лютым пасля таго, як будуць сфарміраваны ўмовы прыватызацыі па кожным прадпрыемстве, а сам пералік будзе ўхвалены калегіяй Дзяржкаммаёмасці Рэспублікі Беларусь.

БУДЗЕ ЎВАЖЛІВЫЯ!

За трое сутак – 145 галалёдных траўмаў

І гэта толькі ў Мінску. Прычым 25 чалавек паслізнуліся і ўпалі так, што трапілі ў шпіталь. Як кажуць спецыялісты, асноўнымі відамі траўмаў былі ўдары, вывіхі, пераломы галёнкаступнёвых суставаў, перадплечча і запясця. Чэрапна-мазгавых траўмаў не было.

Між тым сіноптыкі папярэджваюць, што ў бліжэйшыя дні галалёдзіца захаваецца.

СТАЛІЦА

Ці знойдуцца жадаючыя будаваць новыя дамы?

У Мінску на аўкцыён выставяць каля 30 зямельных надзелаў для будаўніцтва шматкватэрнага жылля, паведаміла начальнік сектара рэалізацыі маёмасных правоў на зямлю аддзела аўкцыёнаў Мінскага гарадскога цэнтра нерухомасці Ірына Германовіч.


Цікава, ці знойдуцца жадаючыя будаваць хмарачосы? За ўвесь мінулы год Мінскім гарадскім цэнтрам нерухомасці на аўкцыёнах было прададзена толькі 8 зямельных надзелаў для будаўніцтва шматкватэрных жылых дамоў. Будаўнічыя кампаніі не заўсёды імкнуцца завалодаць участкамі, ба нярэдка на тэрыторыях знаходзяцца аб'екты, якія падпадаюць пад знос, і людзей трэба рассяляць. Гэта патрабуе грошай і не выключае доўгіх спрэчак, нярэдка – судовых. Таксама ў сталіцы, як адзначаюць рыэлтары, зараз мала купляецца новых кватэр, як кажуць, у чыстым выглядзе. Звычайна людзі прадаюць старую кватэру, дадаюць 15–20 тысяч долараў і купляюць іншую. У многіх новабудоўлях да гэтага часу яшчэ застаюцца непрададзеныя кватэры.

ПЕРСОНА

Варламов

25 вопросов модельеру, который готовит коллекцию одежды специально для Светланы Алексиевич и считает, что смена гардероба – это как репетиция новой роли.





Да, одежды с маркой «Варламов» в магазинах нашей страны нет. Хотя не так уж мало людей тем не менее заказывают гардероб именно у этого модельера. Потому что есть громкое имя в национальном модельном бизнесе, есть стиль, творческое направление и, в конце концов, есть известный педагог, дизайнер, режиссер и крайне выразительный человек Саша Варламов – и спорить с этим трудно. Хотя сам Саша, по моему впечатлению, поспорить всегда готов. Он человек неуспокоенный, даже смятенный, временами бунтарский.

Не так давно Саша Варламов пережил трагедию: был под следствием. Осужден за финансовые нарушения. Освобожден из-под стражи в зале суда. Выплачивает компенсацию государству. Что ж, не минула его чаша сия…

Но творческая жизнь художника-модельера продолжается.

1. – Саша, как ваше здоровье?

– Я сегодня впервые за последнее время вдруг почувствовал себя легче. А так приходится превозмогать боль каждую минуту. И вдруг отпустило – освобождение! Но вообще по утрам с постели встаю по полчаса. У меня в 12 местах поврежден позвоночник.

2. – Как же вы заработали столько повреждений?

– Это все нары.

– А еще говорят, что спать на твердом полезно, что это способствует…

– Ничего там, в тюрьме, не способствует. Ну и плюс ко всему операция на позвоночнике, которую я там же перенес в наручниках. В тюремной больнице даже капельницу мне ставили, не снимая с меня наручников.

3. – Вы нашли объяснение драме, которая с вами произошла?

– Конечно. Я и бизнес – понятия совершенно не совместимые. Я делал государственный проект. За 20 лет мне не было выделено ни одной копеечки в виде заработной платы, я тянул его за свои деньги. Мне вменили в вину неуплату налога. Но зарплаты-то не было!

4. – Но как вы попали в ловушку?

– У меня было с десяток шансов избежать ареста: не возвращаться в страну, например. Но то, что предначертано Богом, невозможно изменить. Зато у меня была потрясающая возможность взрастить себя.

– Но вы не отвечаете на вопрос: как же вы попали в эту ситуацию? Как допустили ее в свою жизнь?

– Если Бог что-то замыслил по отношению к человеку, то никто не в праве, не в состоянии и не в силах… Ведь все, что дается, не случайно. В любом случае надо держать, нести себя. Нам даны враги, чтобы делать работу над ошибками.

5. – Вы много друзей потеряли?

– Нет. Знаете ли, больше приобрел. Захожу в троллейбус, вдруг кто-то подходит: «Держитесь! Мы вас любим». В то же время видно, что этот человек далек от модных показов, от мира моды. Тогда что я ему даю? Откуда он знает мое имя?

– Чувство соучастия?

– Вот! И это очень важно. И я начинаю уже по-другому оценивать ситуацию в стране, задумываться, почему Бог это допускает… Знаете, почему люди мучаются перед смертью? Они в это время, как на наковальне, – а Бог в этот момент их прощает. А потом наступает освобождение. Вспомните лица ушедших… Они свободные. Кстати, те, кто сдал меня на суде, пришли потом ко мне и сказали: «Поймите, нас заставили». Тяжело ведь с грехом жить.

6. – Счастливая судьба, что хоть выпустили… Вы сделали выводы после этой катастрофы?

– Конечно! Конечно, сделал: надо дальше идти, надо дальше доказывать самому себе, что ты был прав. И еще меньше обращать внимания на всякую ерунду. Не чиновники в конечном счете правят миром, а любовь. Если я остался в живых, это знак свыше, что я должен идти дальше.

7. – На что вы живете? У вас маленькая пенсия, из которой по решению суда высчитывают приличную сумму.

– Помогают друзья. Они дают деньги на лекарства – хочу им сказать большое спасибо. Их помощь держит меня на плаву. А лекарств мне нужно много…

8. – Над чем сейчас работаете?

– Я не имею права работать, я на инвалидности. Просто занимаюсь любимыми делами.

– Но время на интервью выкроили с трудом: примерки, встречи…

– Есть люди, которые хотят общения со мной. Потому что во время примерки происходит нечто большее, чем смена гардероба. Это как репетиция. Когда делаешь одежду, в своем роде закладываешь текст роли того, кто ее будет носить.

9. – Светлана Алексиевич была, кажется, в восторге, когда однажды на приеме во французском посольстве вы одним движением преобразили ее, накинув на плечи шарф другого цвета, не из ее гардероба. Сотрудничество продолжилось?

– Да, мы создали для нее целую коллекцию одежды – правда, пока только на холодный сезон.

– Как она покорилась вам? Светлана Александровна – не легкий хлеб для модельера в том смысле, что у нее есть своя генеральная линия. Впрочем, как во всем.

– Сначала, конечно, был конфликт. А потом мы притерлись, нашли общий язык. Она поверила, что мы ее не портим и не пытаемся превратить в буржуазную дамочку. Ну, понятно, что это был бы уже грех на душу. Вообще мне сложно понять моду 25-летних.

10. – Вы не одобряете моду молодых?

– Спорить с модой вообще и с молодежной в частности – это плевать против ветра. Правда, сейчас, когда смотришь на молодых, ощущение, что они все из балета – все в обтяжку! Только балетных туфель не хватает. Но пусть ходят как хотят. Хоть на голове. Знаете, в этом возрасте на человека можно набросить тряпочку – и все, образ готов. Мне интересно одевать людей старшего возраста. Для них одежда – это как третий глаз. Будто взяли и… преобразили.

11. – А что такое женственность, по-вашему?

– Часто это всего лишь похоть.

– Просто наотмашь. Саша, вы радикал!

– Нет. Но когда женщина кокетничает… Для чего, я вас спрашиваю?.. Можете не отвечать!

12. – А как вы относитесь к эпатажу? В вашей профессии это необходимая краска?

– Если эпатаж не агрессивен… Эпатаж – это, по-моему, признак инакомыслия. И он не всегда на грани фола. Эпатаж – любое яркое проявление творчества.

13. – Как вы думаете, в чем же тайна моды?

– Мы, дизайнеры, предлагаем людям уход от стереотипов, меняем мышление. Я благодарен моде – она сделала меня толерантным на 100 процентов. Модельер по определению не может быть агрессивным, нетерпимым, потому что в моде на самом деле можно все!

14. – Есть такое выражение: Бог дал пищу, а дьявол – кулинарию. В том числе и моду. Новая одежда – это ведь вечное искушение, не так ли?

– Неправда! Если мы одеваемся так, чтобы нам под юбку заглядывали, то – да, искушение, гламур. Но настоящая мода не предполагает гламура. Например, сегодняшняя мода совершенно асексуальна.

15. – Вы смотрите «Модный приговор» по ТВ?

– Нет. Слово «приговор» в моде неприемлемо! Каков состав преступления у бедных женщин?! Не ту кофточку надела?

– Вы слишком серьезны.

– Там много гламурной размазни. Она для тех, кому нечего делать – по обе стороны телевизора.

16. – Возможно, это слишком книжные представления о работе модельера, но все-таки художественные произведения влияют на ваши творческие идеи?

– Постоянно! К примеру, «Дикая охота короля Стаха» Короткевича вдохновила меня на коллекцию «Три всадника» в 2006 году. Но вообще я воспитан на эстетике Елизарьева. Считаю его единственным по-настоящему большим художником в нашей стране. Странно, что Елизарьев и балет разъединены…

17. – К вам никогда не обращались с белорусского ТВ, чтобы помочь одеть дикторов?

– Я сотрудничал с телевидением когда-то, до ареста. В моих костюмах работали ведущие АТН. А сейчас я не смотрю белорусского телевидения. Только «Евроньюс» и фильмы. Мне достаточно. И как на БТ одеты люди – я им не судья.

18. – Я сколько помню, вы всегда в черном или темном свитере или водолазке. Почему?

– Потому что в принципе не хочу себя каким-то образом позиционировать. Я хочу устраниться! Не хочу выделяться. Если я в черном – меня словно нет. Мне всегда очень тяжело даже выйти на сцену после показа.

19. – Почему вы предпочитаете короткое имя Саша, принятому у нас, восточных славян, имени и отчеству?

– Меня так мама звала… И вы приезжайте в другую страну – там все зовут друг друга только по имени…

– Но при чем здесь другая страна? Мы живем в своей…

– Мне абсолютно до лампочки отчество. Я не живу прошлым, я абсолютно никому ничего не должен. Меня зовут Саша.

20. – Я прочитала в одном интервью, что вы не любите женщин: «Баб не люблю». Почему? Они вас предавали?

– Я не люблю в женщинах бабское, тётское.

21. – Почему в модельном бизнесе много геев? Как вы думаете, это результат общения модельеров с обнаженным женским телом?

– Не уверен, что среди кутюрье больше всего геев. Но что правда, так это то, что модельеры, дизайнеры – люди, которые в большей степени, чем остальные, не зависят от стереотипов.

22. – Сколько вам не жалко потратить на пиджак? Я хочу понять: сам модельер может купить очень дорогую фирменную вещь?

– Если он больной, то – может. А я, если заметили, вообще не ношу пиджаки. Мы платим сумасшедшие деньги за бренды. А что такое бренд? Сотрясение воздуха и не больше. Себестоимость джинсов Пьера Кардена на самом деле два с половиной доллара. Зачем себе врать? Два с половиной!

23. – Что главнее для женского образа: одежда или обувь?

– Голова.

24. – Почему возникает ситуация, когда много одежды – надеть нечего?

– Понимаете, есть такое состояние души, когда никакая одежда не может ему соответствовать: внутренний разлад, конфликт. И человек стоит перед раскрытым шкафом… Потому что, когда в душе гармония, человек одевается, не задумываясь.

25. – Интересно, портновское искусство в Беларуси на достаточно высоком уровне?

– Оно, по-моему, абсолютно никакое, особенно в системе профтехобразования. Нет передачи опыта от старших к младшим. Сегодня не найти белошвейку, которая проложила бы ровный стежок. Идет вырождение специалистов. С другой стороны, сейчас люди перестали в быту обращать внимание на индивидуальность в одежде, сейчас мы как бы убрали одежду как способ идентификации. И это прекрасно. Потому что на первый план выходит не тряпочка, а мысль. Раньше мода занимала слишком много места в жизни. Не надо! Сейчас не так уж важно, в чем ты. Сегодня важно, кто ты.

– И это говорит модельер! Спасибо за встречу.

Елена МОЛОЧКО.

Досье «Народной Воли»

Саша Варламов – автор коллекций одежды, постановщик спектаклей – синтеза моды, хореографии, музыки и литературы. Организатор конкурса «Супермодель Беларуси» (1992–2000), фестиваля-конкурса моды и фото «Мельница моды». Организатор показов белорусской моды в странах Европы.

Кавалер серебряной медали почетного гражданина Рима (2005 г.).

НЕЗВЫЧАЙНЫЯ ЛЮДЗІ



Юрый Барок: прафесія – пілігрым

Здараецца, ён праводзіць у дарозе палову месяца і болей. Беларускі ксёндз-падарожнік суправаджае пілігрымкі па ўсёй Еўропе. "Народная Воля" распытала ксяндза Юрыя БАРКА пра вучобу ў Рыме, стаўленне да сексуальных меншасцяў і вандроўкі, якія змяняюць жыццё кожнага чалавека і прыводзяць яго да веры.

– Ксёндз Юрый, беларусы – рэлігійная нацыя або не?

– Калі ўспрымаць візуальна, дык у нядзелю храмы поўныя – і каталіцкія касцёлы, і праваслаўныя цэрквы. Калі вылічваць працэнтныя суадносіны, вернікаў не так шмат. Але наведванне касцёла – не той паказчык, які цалкам сведчыць пра ўзровень нашай веры. Апостал Якуб кажа ў сваім пасланні: "Вера без учынкаў мёртвая". Вера выяўляецца менавіта ва ўчынках і тады, калі яна трансфармуецца ў пэўны ўчынак. Часам можна пачуць папрок: маўляў, у Заходняй Еўропе мала вернікаў. Але паглядзіце на немцаў: колькі яны ажыццяўляюць сацыяльных дабрачынных праграм і акцый!

– Існуе стэрэатып, што каталікі жывуць выключна на захадзе Беларусі. А ўсход, маўляў, праваслаўны. Гэта так?

– Казаць, што ўсход праваслаўны, не зусім карэктна. Пэўны час я служыў пробашчам-настаяцелем у Шклове. Рэстаўраваў там касцёл, шукаў для гэтага фінансавыя сродкі. Наогул, спрыяў далейшаму развіццю там Касцёла: гаворка, як вы разумееце, не пра будынак, а пра жыццё парафіі. Дык вось усход Беларусі ў рэлігійным сэнсе хутчэй абыякавы. Нават праваслаўныя бацюшкі прызнаюцца, што рэлігійнае жыццё ў іх прыходах больш актыўнае менавіта ў заходніх рэгіёнах Беларусі. У савецкія часы царква на ўсходзе краіны была амаль знішчана. Каталіцкі касцёл – асабліва. Таму людзей, якія прыходзяць на службу ва ўсходняй Віцебшчыне або Магілёўшчыне, няшмат. Хутчэй гэта перасяленцы з заходняй Беларусі. Або тыя, хто захаваў старыя традыцыі.

– Вы атрымалі адукацыю ў Гродзенскай духоўнай семінарыі. Цікава, а пасля яе заканчэння таксама існуе абавязковае размеркаванне, як пасля свецкіх ВНУ?

– Размеркаванне пасля семінарыі вельмі строгае. Чалавек можа выказаць пажаданне, дзе ён сябе бачыць: хоча працаваць у нейкім прыходзе або працягнуць вучобу. Але гэта толькі пажаданне, да якога біскуп можа прыслухоўвацца а можа – і не. Толькі ён вызначае месца працы пэўнага святара. Напрыклад, пасля семінарыі я працаваў вікарыем у Бабруйску, пасля – у мінскім Чырвоным касцёле, пазней трапіў у Шклоў. Гэтаксама біскуп можа сваім рашэннем перавесці святара ў іншую парафію ў межах дыяцэзіі або памяняць дыяцэзію ў межах краіны (Рымска-каталіцкая царква ў Беларусі налічвае 619 парафій, аб'яднаных у 4 дыяцэзіі. – Рэд.). А вось накіраваць святара на працу за мяжу можна толькі з яго ўласнай згоды. Хоць, вядома, патрабуецца дазвол біскупа.

Прыкладна дзесяць гадоў таму я звярнуўся з такой просьбай. Мне было цікава здабыць новы досвед місіянерскай працы з іншымі народамі і культурамі. Працаваў у Чэхіі, Італіі, Індыі, афрыканскім Зімбабве, а пазней – у Ізраілі. Дарэчы, усюды імкнуўся надзвычай хутка вывучыць мясцовую мову. Як жа працаваць для гэтага народа? Напрыклад, пасля трох месяцаў жыцця ў Чэхіі ў мяне ўжо не было моўнага бар'ера. Пазней гэтаксама вучыў італьянскую і англійскую мовы.

– У Рыме вы вучыліся ў Вышэйшай тэалагічнай школе. Ці існуюць адрозненні паміж рэлігійнай адукацыяй у Беларусі і ў Італіі?

– У сталіцы Італіі я вучыўся толькі семестр. Але нават за гэты час адчуў велізарную розніцу. Напрыклад, возьмем такое пытанне, як каланізацыя і хрысціянізацыя Лацінскай Амерыкі. З пазіцыі Касцёла мы можам сказаць, што гэта надзвычай пазітыўная падзея. Бо мясцовае насельніцтва пачула Божае слова. Але, калі зірнём, якім чынам і спосабамі адбывалася хрысціянізацыя, усё выглядае не так адназначна. Магчыма, сам пасыл быў добрым, але якой цаной быў дасягнуты вынік? Да прадстаўнікоў трэцяга свету ўжываўся гвалт, а мясцовая культура і лад жыцця былі знішчаны. Можна запытацца больш катэгарычна: наколькі апраўдана такая евангелізацыя? На гэтае пытанне няма адназначнага адказу. Але ў Рыме прысутнічае большая цярпімасць і талерантнасць у такіх дыскусіях.

– Вы кажаце пра талерантнасць, а я адразу згадваю выказванні Папы Францыска. Ён лічыць, што прадстаўнікі сексуальных меншасцяў таксама заслугоўваюць падтрымкі царквы. Вы з ім згодны?

– Вельмі далікатнае пытанне. Чую на гэты конт розныя меркаванні. У тым ліку такое, што для беларускага грамадства зарана яго публічна абмяркоўваць. Я заўсёды падкрэсліваю, што незалежна ад сексуальнай арыентацыі мы павінны бачыць у чалавеку асобу. А ўжо потым звяртаць увагу на яго арыентацыю і лад жыцця.

– Нядаўна Папа Францыск спыніў дараванне святарам ганаровых тытулаў. У сацыяльных сетках вы пракаментавалі гэту навіну так: "Ну нарэшце, завершыцца маскарад. Можа, і ад "сукенак" адмовімся?"

– Мой каментарый у "Фэйсбуку" гучаў хутчэй як жарт. Калі глядзець аб'ектыўна, то святар, чыя парафія або прыход жывыя і працуюць добра, павінны быць заўважаны. Кожная праца можа быць адзначана. Гэта аб'ектыўна і слушна. Адзінае, мы толькі павінны не забывацца, што не гэта самае важнае ў духоўным жыцці святара. Гэты тытул не дадае яму духоўнай вагі. Таму ў такой адмове ёсць сэнс.

– А што тычыцца права на палітычную пазіцыю?

– Ёсць рашэнні другога Ватыканскага сабора 1960-х гадоў, калі святару было забаронена належаць да нейкай палітычнай партыі або руху. Бо яго прыхаджанамі могуць быць людзі розных поглядаў. Але святар, як кожны чалавек, мае не толькі права, але і абавязак мець уласную пазіцыю. Не бачу тут ніякай супярэчнасці.

– З чым цяпер звязана ваша праца ў царкве?

– Суправаджаю пілігрымкі. За мяжой царква часта арганізуе паломніцтвы да святых месцаў. Магчыма, раней у Беларусі рабіліся нейкія захады, але сістэмная праца адсутнічала. Хацелася, каб чалавек незалежна ад сваёй канфесійнай прыналежнасці мог далучыцца да падарожжа, паехаць у Ватыкан, на Святую Зямлю або ў іншыя святыя мясціны. Так паўстаў праект "Piligrymka.by", арганізаваны парафіяй Святога Язафата Кунцэвіча ў Расонах. Я працую гідам-святаром у паломніцкіх турах. Вандруючы па Еўропе, часам праводжу ў дарозе палову месяца.

– На сайце Piligrymka.by праводзілася цікавае апытанне. Згодна з вынікамі, 42 працэнты рэспандэнтаў падарожнічаюць праз пілігрымкі, бо праграма адпавядае іх хрысціянскаму светапогляду, 33 працэнты адказалі "бо я каталік", 17 працэнтаў – "гэта нядорага", 8 працэнтаў выбралі "іншае". Які сэнс царкве спрыяць вандроўкам за мяжу людзей, не ўсе з якіх з'яўляюцца яе прыхільнікамі?

– Для нас важна, што ў няверуючага чалавека ўзнікае жаданне далучыцца да такой вандроўкі. Бо падарожжа – гэта не толькі тое, што мы бачым за акном (хоць для турыста відавочна, што праявы веры ўвасабляюцца ў культуры, архітэктуры, побыце). Гэта дыялог і духоўныя разважанні, на якія чалавек у штодзённым жыцці не знаходзіць часу. А тут, хочаш не хочаш, ён уцягваецца ў дыялог. Падчас доўгіх пераездаў чалавек часам задае пытанні, пра якія саромеецца запытаць у свайго святара.

– Якую ролю адыгрываюць пілігрымкі ў вашым жыцці?

– Раскажу вам адну прыпавесць. У Кракаве жыў яўрэй Давід, які марыў пабудаваць сінагогу. Але ён быў бедны, а таму не меў грошай. Аднойчы яму прысніўся сон, у якім да яго прыйшоў Бог і сказаў: "Давід, пакінь усё, свой дом, заняткі, сям'ю, працу і выбірайся ў Прагу. Там пад Каралеўскім мостам ты знойдзеш скарб". Яўрэй прачнуўся і толькі пасмяяўся: "Як можна верыць снам?" Але сон быў яшчэ двойчы. Тады Давід развітаўся з жонкай і накіраваўся ў Прагу. Нарэшце трапіў да Каралеўскага моста, але не наважыўся капаць, бо там знаходзілася варта. Прайшоў дзень, два, тры, але Давід толькі пазіраў на гэтае месца. Нарэшце кіраўнік варты не вытрымаў, падышоў да яўрэя і запытаўся: "Чаму кожны дзень ты прыходзіш сюды?" Таму давялося распавесці пра сон. Старшыня варты папляскаў яго па спіне і толькі засмяяўся: "Наіўны ты чалавек! Як можна верыць у сны?! Мне таксама аднойчы прысніўся сон. Бог мне сказаў: "Пакінь сваю працу, ідзі ў Кракаў, знайдзі нейкага яўрэя Давіда. У яго доме за печкай знойдзеш скарб з залатымі манетамі". Давід сцяміў, што гаворка ідзе пра яго. Ён вярнуўся дадому, знайшоў скарб. А мараль прыпавесці простая: скарб знаходзіцца там, дзе мы жывём, дзе наш дом. Але, каб зразумець гэта, чалавеку часам трэба выправіцца ў падарожжа.

Гутарыў Максім ПЛОТНІКАЎ.

КОЛОНКА ЮРИСТА

На вопросы читателей "Народной Воли" отвечает юрист правозащитного центра "Правовая помощь населению" (Киев, Украина) Александр МИКУЛИН.



...Не освобождаются

Я член садоводческого товарищества с 1992 года, пенсионерка, от уплаты земельного налога освобождена. Имею в собственности земельный участок площадью 10 соток и на нем дачный домик. Светом, водой в товариществе не пользуюсь. Обязана ли я платить членские взносы?

В.Ивановская, жительница Могилева.

Члены садоводческого товарищества обязаны своевременно вносить взносы, это закреплено п.19 Положения о садоводческом товариществе, утвержденном Указом Президента Республики Беларусь №50 от 28 января 2008 года.

Пенсионеры не освобождаются от уплаты взносов по действующему законодательству. Но Вы можете на общем собрании товарищества инициировать вопрос о предоставлении льгот при уплате взносов некоторым категориям граждан, в том числе и пенсионерам. И только в том случае, если собрание решит такую льготу предоставить, вы сможете частично быть освобождены от уплаты взносов.

Все зависит от наследуемого имущества

Жена взяла два кредита в ЗАО «Идея Банк» на общую сумму 8.539.202 белорусских рубля. В том же году она умерла. Теперь из моей пенсии высчитывают каждый месяц по 540 тысяч рублей, хотя я не являлся поручителем. Знакомые говорят, что банк не имеет права забирать часть моей пенсии.

Е.Г.Рыжов, г.Лепель.

Должны ли Вы отвечать по долгам своей умершей жены? Согласно законодательству, наследники отвечают по долгам наследодателя в пределах стоимости перешедшего к ним наследственного имущества (п.1 ст.1086 ГК Республики Беларусь).

Для того чтобы точнее ответить на Ваш вопрос, необходимо знать, какое имущество Вы приняли в наследство после смерти жены, какова его стоимость, а также размер задолженности перед банком, образовавшийся на момент открытия наследства. Если стоимость наследственного имущества превышает размер долга, то наследник должен полностью погасить долг. Если не превышает – погашает частично, в пределах стоимости имущества. Удержания из пенсии для погашения долга допускаются законодательством.

Решает суд

Можно ли признать договор дарения квартиры, которую мама подарила старшему брату, недействительным? Дело в том, что еще раньше мама оформила завещание на мою сестру. Но брат некоторое время жил с мамой, он злоупотребляет спиртными напитками. Был случай, что он маму избил. Нам с сестрой известно, что он маму обманул: привез на квартиру нотариуса и предложил маме подписать документы якобы на регистрацию в квартире, а на самом деле это был договор дарения.

Владимир Ф., Минск.

Любая сделка, в том числе и договор дарения квартиры, может быть признана недействительной по постановлению суда. Но гражданин или другие лица, чьи права и интересы нарушены в результате ее совершения, должны привести веские доказательства в обоснование своих требований. Судя по содержанию Вашего письма, следует проверить эту сделку на предмет законности. При совершении сделки дарения должен присутствовать свидетель. Также надо изучить состояние здоровья матери, выяснить, могла ли она отдавать отчет своим действиям. Вам лучше обратиться к адвокату для решения вопроса о целесообразности подачи иска в суд.

ДИСКУССИЯ


Наемный работник или хозяин на земле?

Заметил, «Народная Воля» еще не поставила точку в дискуссии, вызванной статьей Мечислава Гирутя «Не отпихивайтесь от народа, и он сделает Беларусь процветающей», опубликованной в газете «Народная Воля» 23 сентября. Вот и я решил высказаться.

Постановка вопроса правильная, но что стоит за красивыми словами? Во-первых, что собой представляет народ? В немалом количестве это люди, которые сегодня зарабатывают чуть более трех миллионов рублей в месяц. Скажите, какие интересы могут двигать ими? Чего греха таить, чтобы прожить, приходится порой идти на воровство. И пример в этом им показывают те же чиновники. Десятки лет они раскрадывают колхозы и совхозы. Преуспевают в этом позорном деле и наемные работники. Почему? Здесь мы имеем дело с отчуждением человека от собственности. Существует эта собственность в наиболее уродливой тоталитарной форме – в форме государственной собственности. У нас государственная собственность отчуждена, обезличена и не имеет ответственного хозяина.

Фактически частным собственником у нас является правящая бюрократия, но и она отчуждена от ответственности за эту собственность. С одной стороны, государственный карман для нее свой, из которого она сама себе назначает и распределяет различные привилегии. С другой – не несет личной ответственности. Наемному работнику безразлично, на кого работать: на частника-капиталиста или на государство. Важно, что в обоих случаях он не распоряжается ни своим трудом, ни его результатами. А потому ему безразлично, какой продукт он создает, какого качества и нужен ли вообще кому-нибудь этот продукт. Это отчуждение труда, как известно, ведет к отчуждению человека от самого себя, от своей человеческой сущности. Питаемая государственной собственностью наша система всеобщего отчуждения человека, по моему мнению, и есть основание нашего социального, экономического и политического кризиса.

Если чиновники, которые все больше и больше удаляются от народа, пытаются удержать эту систему путем жесткого регулирования, замыкая все связи на себя, она становится неспособной к развитию, делается искусственно заторможенной. Здесь нужны радикальные реформы, а не фразерство. Нужно признать, что созданные в ходе сплошной коллективизации предприятия, получившие название «колхоз», не были по существу кооперативными хозяйствами. Это и



привело к отрыву человека от земли, от средств производства. То же произошло и в совхозах. Радикальные реформы призваны изменить отношение селянина к труду, возродить крестьянство, через изменение производственных отношений обеспечить лучшие социальные условия жизни села.

Всем понятно, что в условиях монополии государственной собственности чиновники не могут жить интересами простого народа, они служат не ему, а тем, кто их назначает на высокие посты. В условиях монополии госсобственности невозможно создать и эффективную экономику. Без разгосударствления и приватизации в агропромышленном комплексе выход из кризиса невозможен. Ведь основа всех преобразований в экономике – это собственность. Именно поэтому сегодня нужно начинать приватизацию в аграрном секторе экономики. Субъект труда должен владеть и распоряжаться средствами труда и своим продуктом. Ведь нашим чиновникам хочется десятилетиями держать народ на иждивенческом положении при хозяйственной апатии и чиновничьем распределительстве.

Одним из направлений в сельском хозяйстве должна стать кооперация. Еще теоретик крестьянской кооперации А.В.Чаянов блестяще доказал ее преимущество перед другими формами организации сельскохозяйственной деятельности, предсказал перспективность частных крестьянских хозяйств, объединенных сетью кооперативов. Именно по такому пути пошли многие страны мира – и преуспели в развитии сельского хозяйства. К примеру, можно назвать Китай и Японию. В Японии насчитывается около пяти миллионов фермеров, и все они охвачены кооперативным движением. Такое положение сложилось в результате действия закона о сельхозкооперативах, в соответствии с которым все крестьяне автоматически становились членами кооперации, а через нее правительство проводило новую аграрную политику. В результате Китай и Япония за короткий срок (за 10–15 лет) добились изобилия сельхозпродукции.

А что сделали за последние 20 лет наши чиновники, которые, как считает М.Гируть, должны любить и уважать свой народ, не отпихиваться от него? Ровным счетом ничего. Как сидели мы у разбитого корыта, так и сидим. Разве до сих пор не видно всем, что наилучшим выходом из кризисной ситуации является приватизация колхозов и совхозов и их трансформация в экономически жизнеспособные ассоциации и кооперативы, не нарушая создавшуюся инфраструктуру? Накопившийся в мире опыт показывает, что она нужна и полезна всем: и сильным, и слабым хозяйствам. Тем более сейчас кооперация необходима немногочисленным белорусским фермерам, оказавшимся в сложном материальном и финансовом положении. В таких условиях кооперация может стать важным фактором выживания и становления фермерства.

Кооперативное движение многообразно. В каждом конкретном случае должна быть разработана собственная модель этого формирования. Нужно кооперировать услуги для фермеров: сбыт, снабжение, переработку, ремонт и так далее. Все это можно делать на кооперативной основе. Важно для проведения кооперирования фермерских хозяйств иметь в каждом районе свой центр (штаб) в виде ассоциации фермеров. Создание такого центра позволит снять с фермеров проблемы поиска удобрений, приобретения и доставки сельскохозяйственной техники.

С увеличением количества техники в фермерских хозяйствах встает вопрос об организации технического обслуживания, ремонта, обеспечения запчастями и так далее. Для выполнения этих задач в составе кооператива необходима организация предприятия по ремонту и обслуживанию техники. Оно может быть создано на базе мастерской реформированного колхоза или совхоза. И здесь, кстати, нужна помощь тех же чиновников. Они должны не ставить палки в колеса, а без проволочек решать организационные вопросы. Финансовый успех работы кооперативов зависит от того, в какой мере в производстве применяются прогрессивные технологии. Выполнению этих задач должен способствовать центр по обучению фермеров в составе кооператива.

Сегодня нашему фермеру трудно рассчитывать на успех в одиночку. Быстрее и масштабнее можно сделать это сообща, организуясь в кооператив. Развитию сельскохозяйственной кооперации должна способствовать правительственная политика. С этой целью для расширения производства отдельных видов сельхозпродукции нужно, на мой взгляд, для кооперативов приостановить выплату налогов, выделить им прямые субсидии, используемые как временные мероприятия для стимулирования производства.

Высокие чиновники должны подумать, каким образом государство может предоставить кооперативам кредитную помощь для модернизации сельскохозяйственного производства, покупки земли, ремонта производственных помещений, строительства дорог, приобретения техники. Все это чрезвычайно важно, если нынешняя власть намерена проводить рыночные реформы в сельском хозяйстве. Если нет, то никакой экономический популизм и фразерство чиновников не помогут добиться успеха в экономике. На пустом энтузиазме народа страну не поднимешь. Человеком должен двигать интерес, заявляет Мечислав Гируть. И правильно заявляет. А этот интерес, я считаю, прежде всего заложен в частной собственности. Только частная собственность побуждает уважать чужую собственность, порядок и власть. Колхозная собственность – это архаичная форма коллективизма и бесправия. Переход от нее к свободной гражданской личности и частной собственности должен быть неизбежен. И, я думаю, если мы действительно строим правовое государство, то не должны быть против частной собственности на землю. И отдать ее нужно народу, а не чиновникам, которые распоряжаются этой собственностью. Нужно не на словах, а на деле любить свой народ. А пока, скажем прямо, идет ограбление белорусского народа.

Александр ЗАРЕНОК, экономист.

Калинковичский район.

НАПАМІН

Павел САКОВІЧ

Не прадавайце дом бацькоў



Я заклінаю ўсіх сыноў:
Хай будуць цяжкасці любыя,
Не прадавайце дом бацькоў,
Вас не ўратуюць грошы тыя.
Яны дабра не прынясуць,
Ніколі не дадуць спакою,
Агнём вам рукі апякуць,
Нібы праказаю якою.
Не прадавайце родны дом,
Бо ён не крама пры дарозе.
Бацькоў успомніце дабром –
Іх след не сцерся на парозе.
Дзядоў і продкаў вашых дух
Прыжыўся назаўсёды ў хаце.
Яшчэ агеньчык не патух,
Што запаліла ў печы маці.
Не прадавайце дом бацькоў,
Бо без яго не пражывеце:
Ён будзе сніцца зноў і зноў,
Пакуль вы ёсць на гэтым свеце...

МУДРЫЕ МЫСЛИ

Бруно ЯСЕНСКИЙ:

– Не бойся врагов – в худшем случае они могут тебя убить. Не бойся друзей – в худшем случае они могут тебя предать. Бойся равнодушных – они не убивают и не предают, но только с их молчаливого согласия существуют и подлое предательство и убийство.

З НАТУРЫ

Жаніх з пасагам

Адзін раз у год, а дакладней глыбокай восенню, на падворку Міхася Азярыцкага з вёскі Сінявец панавала ажыўленне: сыны з нявесткамі ды ўнукі прыязджалі калоць парсюка. І ў гэты раз, наладаваўшы багажнікі машын сумкамі са свежанінай ды мяшкамі з агароднінай і яблыкамі, Алесь і Мікола са сваімі сем'ямі зазбіраліся назад у сталіцу.

– Вось вы паедзеце, а мне зноў аднаму заставацца. Сумна вечарамі, хоць вый, – паскардзіўся бацька.

– Калі табе сумаваць з такой гаспадаркай? – усумніўся Мікола. – Конь, авечкі, яшчэ трое свіней засталося. Толькі паспявай паварочвацца.

– З імі ж не пагамоніш. І тэлевізар ужо абрыд да чорцікаў. Раней хоць на сяло да каго мог схадзіць, а цяпер толькі бабулькі Марыля ды Ніна засталіся. І я адзін, як пень ля дарогі...

– Я ведаю, што трэба рабіць, – раптам ажывіўся Алесь. – Трэба табе, бацька, шукаць жонку.

– Ага, вазьміце мяне ў сваты да старой Агаты, – усміхнуўся Міхась.

– Навошта табе ездзіць у сваты? Толькі дай аб'яву ў якую газету, то бабы папруць лавінай. Многія замуж хочуць. Я сам гэтай справай займуся. Клюнуць на цябе, не сумнявайся, бо ты ж яшчэ мужчына дужы, што там 62 гады! І гаспадарку моцную маеш, так бы мовіць, жаніх з пасагам, і хата дагледжана. Так што неўзабаве будзе табе весялей. Гарантую.

Міхась газет не выпісваў, але што ў адной з іх была ягоная аб'ява, здагадаўся адразу: недзе з палудня яго пачалі атакаваць кабеты. Званкі былі з усіх куткоў краіны. Адны цікавіліся яго вагой і ростам, другія – дзецьмі і ці няма з імі якіх праблем, бо цяперашнім часам усяк бывае. Трэція хацелі ведаць пра жылплошчу і пенсію. Міхась на ўсе пытанні даваў грунтоўныя адказы. Ён клаўся і ўставаў пад тэлефонныя званкі. Неяк неўпрыкмет яго хата ператварылася ў цэнтр рэабілітацыі жаночых душ. Кабеты вылівалі на Міхася цэлыя вёдры сваіх праблем. Ды не толькі сваіх, але і дзяцей, унукаў, суседзяў. Адзінокім прэтэндэнткам на яго руку і сэрца проста не было з кім пабалбатаць. Спачатку Міхась слухаў уважліва і даваў парады, потым слухаў, так бы мовіць, на палову вуха. Праз некалькі дзён наогул перастаў падыходзіць да тэлефона, а нанач адключаў яго.

Размовы размовамі, а справа з месца не рухалася, жонкі як не было, так і няма.

– Трэба мне з гэтым гарэмам нешта рабіць, – слухаючы, як звініць міжгародні тэлефон, вырашыў для сябе патэнцыяльны жаніх з пасагам. – Пазваню ўсім, чый тэлефон ведаю, і пастаўлю пытанне па сутнасці: ты паедзеш да мяне жыць у вёску?

Нявесты ў першы ж вечар адсыпаліся, як чэрці ад алтара.

– У вёску жыць?! – залямантавала нейкая гамяльчанка такім голасам, нібы ён паклікаў яе паляцець на Марс без білета ў адваротны бок. – Вы што, з глузду з'ехалі? Я ўсё жыццё пражыла ў горадзе, свіней бачыла толькі на малюнках ды па тэлевізары.

– Чаго ты тады мне званіла?

– Проста, душу адвесці. Хочацца ж з кім-небудзь пагутарыць.

– Вось з кім-небудзь і гутары, а ад мяне адчапіся!

Ён бразнуў трубку і набраў другі нумар. Трэці. Усюды поўны аблом. Нарэшце пашанцавала. Адна мінчанка і адна жыхарка Гродна згодны былі пераехаць жыць да яго. Так бы мовіць, хацеў выбраць на конкурснай аснове, правесці кастынг.

Міхась, наколькі гэта было магчыма, уцягнуў жывот, падстрыг перад люстэркам бровы, пагаліўся і пачаў чакаць, бо мінчанка канкрэтна назвала дату прыезду.

Яна прыбыла апоўдні. На нямытых валасах ляпілася шапачка, звязаная, напэўна, у канцы мінулага стагоддзя. Твар меў колер варанага бурака. Пінжак і чаравікі, відаць, для салідасці, былі мужчынскія.

Зайшоўшы ў хату, яна назвалася Алесяй і, дастаўшы з аблезлага цэлафанавага пакета бутэльку танна віна, паставіла на стол.

– Загрызці ёсць чым? – пацікавілася.

Пакуль Міхась хадзіў у камору па каўбасу і іншыя пачастункі, Алеся адкаркавала бутэльку і, узяўшы на палічцы ля парога кубак, наліла туды палову віна.

– За знаёмства! – кіўнула гаспадару і са смакам выпіла. – Гэта табе, – напоўніла кубак зноў. – Па справядлівасці.

– Дзякуй, – ледзь вымавіў зніякавелы жаніх. – Як ты п'еш такую брыдоту? У мяне лепшае віно ёсць.

– Давай, бо гэтага мала.

Міхась не піў і не еў, а толькі назіраў, як патэнцыяльная жонка ўгрызаецца адным пярэднім зубам у салёны гурок.

– Мне ў цябе падабаецца, – ацаніла яна абстаноўку. – І грошы, відаць, маеш.

– Я задаволены тваёй пахвалой, але замуж цябе не вазьму.

– Чаму?! – пакрыўдзілася Алеся.

– А таму, што грошы ў мяне хоць і ёсць, але з тваім алкагольным апетытам іх надоўга не хопіць. Так што бяры з сабой віно, якое не дапіла, і шуруй на аўтобус, а то спознішся на апошні рэйс.

– То, можа, перадумаеш? – спытала з надзеяй.

– Ні за што! – неяк спалохана прамовіў гаспадар.

Гродзенская кабета была зусім не падобная да Алесі. Яна мела 60 гадоў, але выглядала значна маладзейшай. У меру рослая, у меру тоўстая, у меру нафарбаваная. Да прапанаванага віна нават не дакранулася, а з вясковымі пачастункамі расправілася хутка і з ахвотай.

– То, можа, і будзем жыць разам? – з надзеяй спытаў Міхась.

– Будзем. У цябе тут добра. І сам ты яшчэ нічога.

– Толькі май на ўвазе, Вікторыя, у мяне гаспадарка. І немалая. Так што лынды біць не будзеш.

– Гаспадарка?!

– А няўжо ж! Трэба курэй карміць, свіней, авечак. І індыкоў яшчэ не парэзаў. Ну, з канём я сам спраўлюся, а табе есці зварыць, у хаце прыбраць.

– Ты што, здурнеў?! Я на старасці гадоў буду пеклаваць на тваёй гаспадарцы? Хопіць і таго, што ў маладосці ў калгасе душылася, ледзь у горад вырвалася.

– То і жыла б там. Чаго сюды прыпёрлася?

– А я сваю кватэру сыну пакінула. Ён ажаніўся з нейкай выдрай. Я яе на дух не пераношу.

– У мяне тут не прытулак для апойкаў і гультаёў. Так што бывай здарова!

Калі за Вікторыяй зачыніліся дзверы, Міхась пазваніў у Мінск Алесю.

– Ну што, бацька, знайшоў жонку? – адразу спытаў сын.

– Не знайшоў! Нясі аб'яву ў другую газету, бо, мабыць, у таго рэдактара рука цяжкая. Ці час другі падбяры. Нясі на маладзіку, а не ў поўню. Можа, тады мне і пашанцуе.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.

Дзятлаўскі раён.

ПАЗІЦЫЯ

Калі мы з ім развітаемся?

Неяк наведаў дарагі для мяне горад Магілёў. На вуліцы Ленінскай на адным з будынкаў убачыў шыльду "Гістарычная назва вуліцы Вялікая Садовая". Вось, разважаю, цуд: перайначылі назву вуліцы, прычым такую прыгожую. Аднак маё ўзрушэнне было наіўным, таму што на ўсіх астатніх будынках вісяць шыльдачкі з "правільнай", ленінскай, назвай. Калі ж мы развітаемся з гэтым ідалам, які прынёс столькі пакут многім народам?

Мікалай БЕЛЬЧЫКАЎ.

г.Барысаў.

ТАКОЕ ЖЫЦЦЁ

Як я купляла расійскую валюту

13 студзеня, 10 гадзін раніцы. Бягу ў банк, мне трэба купіць 2 тысячы расійскіх рублёў. Нягледзячы на электронную чаргу (як-ніяк, а ў цэнтры Еўропы жывём), пытаюся ў маладой дзяўчыны:

– Скажыце, у вас будзе 2 тысячы расійскіх рублёў?

– Так, якраз будзе. Займайце чаргу.

Я, узрадаваная, села прама насупраць кансультанта, маладой прыгожай дзяўчыны і запытала ў яе:

– Скажыце, а калі ўжо можна будзе свабодна купіць валюту?

– Не ведаю. Мы працуем ад абароту.

– Гэта як?

– Колькі здадуць, столькі і прададзім. Больш я вам нічога не магу сказаць. Мы самі не ведаем.

Мне стала сумна. Нават супрацоўнікі банка не ведаюць, калі ўсё будзе добра з валютай, дык што казаць пра простую пенсіянерку? Дарэчы, курс расійскага рубля к беларускаму расце літаральна кожны дзень. За 2 тысячы расійскіх рублёў заплаціла 520 тысяч беларускіх. А як жа быць тым, у каго крэдыты ў доларах? Гэта жах!

Валянціна БАРЫСАВА.

Мінск.

ШТО ХВАЛЮЕ...

Дзе дзіцячыя беларускамоўныя каналы?

Вельмі часта на старонках "Народнай Волі" друкуюцца артыкулы аб стане беларускай мовы ў нашай краіне. Дыскусіі і роздумы глыбока кранаюць душу. Не магу ўстрымацца ад выказвання сваіх набалелых думак і я.

У адрозненне ад многіх беларусаў я шчаслівая, бо жыву і працую ў беларускамоўным асяродку. Я – настаўніца беларускамоўнай вясковай школы. Выхоўваю двух дачушак, якіх таксама хацела б бачыць сапраўднымі патрыётамі сваёй Беларусі. Напэўна, таму, што працую з дзецьмі, на праблему захавання беларускай мовы гляджу "знізу ўверх" – не з пазіцыі дарослых, а з пазіцыі дзяцей, якія ў большасці сваёй нічога не ведаюць не толькі пра праблему захавання, але і пра беларускую мову ўвогуле. У большасці вясковых школ на беларускай мове, як вядома, выкладаюцца ўсе прадметы. Для дзяцей з гарадскіх школ беларуская мова – гэта такі ж прадмет, як, напрыклад, і руская літаратура, прычым далёка не самы лёгкі і, бадай, не самы любімы. Таму тыя праблемы з роднай мовай, якія мы маем зараз, яшчэ маленькія ў параўнанні з тымі, якія мы атрымаем у будучым. Ужо дасягнула сталага ўзросту моладзь, якая не ведае Беларусі з бел-чырвона-белым сцягам і "Пагоняй", якая не памятае перыяду, калі беларуская мова была адзінай дзяржаўнай, а значыць, іх дзеці не пачуюць калыханак на роднай мове, не пойдуць у беларускамоўныя дзіцячыя садкі і школы і ўвогуле будуць успрымаць беларускую мову як нейкі рудымент, які яшчэ часткова, без пільнай неабходнасці прысутнічае ў грамадстве. Мне страшна ўяўляць сабе такую будучыню роднай мовы, але бачыць праблему трэба, каб мець магчымасць яе вырашаць.

Кожны з "суразмоўцаў" шматлікіх дыскусій мае свае прапановы, бачыць выйсце з існуючай "моўнай" сітуацыі. На жаль, большасць абвінавачвае ў бяздзеянні ТБМ, кіраўніцтва краіны, сістэму адукацыі і г.д. Безумоўна, усе маюць нейкую рацыю, але папрокамі справе не дапаможаш. Назіраючы за сваімі дзецьмі і за вучнямі, бачу, наколькі, нават у беларускамоўнай вясковай (!) школе, ім не хапае прасторы, дзе яны маглі б чуць родную мову.



Размова тут не ідзе аб школьных уроках – яны ляжаць у выхаваўчай і адукацыйнай плоскасцях, а плоскасць захапленняў дзяцей нашмат шырэйшая, і тут вельмі многа месца адводзіцца мультфільмам.

Усе нашы краіны-суседзі даўно маюць дзіцячыя тэлеканалы, якія яшчэ з маленства дазваляюць чуць родную мову, выкарыстоўваць яе. ЧАМУ Ў БЕЛАРУСІ НЯМА НІВОДНАГА БЕЛАРУСКАМОЎНАГА ДЗІЦЯЧАГА ТЭЛЕКАНАЛА? Можна будаваць колькі заўгодна нацыянальных бібліятэк, ствараць нацыянальных інстытутаў, выдаваць беларускамоўных кніг, але гэта не будзе ў поўным аб'ёме выхоўваць з маленства. Я ні ў якім разе не адмаўляю неабходнасць і вартасць існавання вышэйназваных аб'ектаў, але ўсе яны разлічаны на дарослых, адукаваных, з ужо сфарміраваным светапоглядам людзей. Што тычыцца нашага падрастаючага пакалення, то для яго хутка будзе больш зразумелай мова ўкраінская, бо большасць нашых дзяцей маюць доступ да спадарожнікавай сувязі і як вынік – да мультфільмаў на ўкраінскай мове. Дзяржаўная ZALA прапаноўвае шырокі асартымент рускамоўных мульцікаў. Беларускамоўны дзіцячы тэлеканал – не вынаходніцтва веласіпеда, а даўно наспелая аб'ектыўная рэальная праблема.

Разумею, што велізарны складнік стварэння тэлеканала – гэта грошы. Мае думкі, напэўна, падаюцца наіўнымі, але, шаноўныя, ці не за народныя грошы будавалася нацыянальная бібліятэка? Чаму б нам не схадзіць колькі разоў на суботнікі ў імя адраджэння роднай мовы? Калі дзяржава не зацікаўлена ў такой ініцыятыве, дык варта падумаць пра яе таму ж ГА "Таварыства беларускай мовы" і хаця б паспрабаваць "пагрукаць у дзверы" "властей предержащих" дзеля інвестыцый у будучыню роднай мовы. Не трэба шукаць у гэтай справе палітыку і нацыяналізм. Нашым дзецям пакуль невядомы гэтыя словы. Мова не павінна выступаць закладніцай спрэчак і сварак. Мова – сімвал народа, які проста абавязаны несці сваю слаўную гісторыю ў будучыню.

Алёна ЛАПАЦКАЯ, настаўніца беларускай мовы.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
16 СТУДЗЕНЯ 2015 ã.

ПУЛЬС ПЛАНЕТЫ

Уровень Мирового океана стремительно повышается

Американские ученые выяснили, что уровень Мирового океана поднимается гораздо более стремительными темпами, чем раньше.

Согласно опубликованному в журнале Nature исследованию, с 1990 года уровень морей и океанов повышался в 2,5 раза быстрее, чем в первые 90 лет прошлого века.

Ученые считают, что причины этого явления нужно искать в таянии льдов Гренландии и Западной Антарктиды, вызванном антропогенным фактором.

Суд Испании принял иск от «внебрачной дочери» короля

Верховный суд Испании принял к рассмотрению иск о признании отцовства короля Испании Хуана Карлоса I, в прошлом году оставившего свой трон.

Гражданка Бельгии Ингрид Сартьо утверждает, что является внебрачной дочерью испанского монарха. По словам заявительницы, Хуан Карлос вступил в близкие отношения с ее матерью, будучи женатым на королеве Софии.

Представители королевского дома, комментируя подачу иска, заявляли, что утверждения Сартьо не заслуживают доверия. Ранее испанский суд отклонил аналогичный иск.

Хуан Карлос утратил иммунитет от судебного преследования в прошлом году, когда отрекся от престола в пользу своего сына, короля Филиппа.

Во время правления Хуана Карлоса циркулировало много неподтвержденных сообщений о супружеской неверности короля и о наличии у него внебрачных детей.

Колумбийская девочка в 10 месяцев достигла веса пятилетнего ребенка

Девочка Хуанита Валентина Эрнандес из колумбийского города Либано к 10-месячному возрасту набрала почти 20 килограммов, что соответствует весу пятилетнего ребенка. При рождении девочка весила около 2,7 килограмма, однако спустя несколько недель она начала стремительно набирать вес.

Тэм Фрай, руководитель местного благотворительного фонда, который помогает родителям девочки, рассказал, что причинами ожирения может служить одна из наследственных болезней, однако пока врачи не могут поставить ребенку точный диагноз.

СУД

Киевские власти собираются провести заочный суд над Виктором Януковичем и его соратниками

Это делается для того, чтобы иметь законные основания для передачи в бюджет страны арестованных активов бывшего президента Украины. Об этом на своей странице в Facebook поведал глава Министерства внутренних дел Арсен Аваков.

По его словам, «округленный» размер арестованных активов Януковича составляет 4 миллиарда долларов. По его данным, не считая активов в недвижимости и долей в компаниях, арестованные украинскими силовиками активы – деньги на расчетных счетах и высоколиквидные ценные бумаги – составляют 2 млрд долларов за рубежом, а также 1,8 млрд долларов и 6 млрд гривен (около 430 млн долларов) внутри страны.

Как отметил Аваков, эта сумма больше, чем утвержденный годовой бюджет Министерства обороны, МВД и Нацгвардии Украины.

ПРОГНОЗ

Всемирный банк резко ухудшил прогноз по России

По оценкам аналитиков Всемирного банка, падение ВВП России в 2015 году составит 2,9 процента. Ранее ожидалось, что экономический спад будет составлять 0,7 процента. Роста ВВП можно ожидать только в 2016 году.

У СОСЕДЕЙ

Кто возглавит борьбу с коррупцией в Украине?

В процессе создания Национального антикоррупционного бюро Украины в стране создана конкурсная комиссия по избранию директора Бюро и начат прием документов от претендентов на эту должность. На новую антикоррупционную структуру, членами которой, по закону, не могут быть те, кто безуспешно боролся с коррупцией в предыдущие годы, возлагают большие надежды. Общественные организации Украины пристально следят за каждым шагом конкурсной комиссии и немедленно реагируют на любые попытки отклониться от правового поля.

ПОЗИЦИЯ



«Мы не позволим, чтобы на голос свободы надели намордник»

Обама и Кэмерон подтвердили решимость противостоять России

Президент США Барак Обама и премьер-министр Великобритании Дэвид Кэмерон заявили, что тверды в своей решимости противостоять «агрессии» России в Украине. Свою позицию они изложили в статье под названием «Мы не позволим, чтобы на голос свободы надели намордник», опубликованной в газете The Times.

Лидеры двух государств обязались поддерживать дипломатическое давление на Россию. «Если мы допустим, чтобы такие фундаментальные нарушения международного права оставались безнаказанными, мы все пострадаем от нестабильности, которая станет следствием этого», – подчеркнули Обама и Кэмерон.

По их словам, в противодействии политике России была выработана «сильная и солидарная реакция». Запад «послал недвусмысленный сигнал, что международное сообщество не будет стоять в стороне, глядя, как Россия пытается дестабилизировать Украину», – заявили лидеры США и Великобритании.

Кроме того, они затронули проблему исламского экстремизма в свете террористических атак во Франции. Лидеры пообещали выступить единым фронтом против угрозы, исходящей от радикалов и их «извращенной идеологии».

По мнению Обамы и Кэмерона, теракты в Париже, произошедшие на прошлой неделе, не заткнут рот свободе слова.

Польшча выпускае першы электрамабіль



Цана машыны – усяго 5 тысяч еўра. Ездзіць на ёй змогуць нават 14-гадовыя падлеткі.

Фірма Romet – вядомая ў Польшчы як вытворца скутараў, матацыклаў і квадрацыклаў. Сваю навінку – электрамабілі – фірма мае намер прадаваць у асноўным у Нямеччыне, Італіі і Францыі.

ОПРОС

Большинство россиян считают Путина незаменимым

Более половины россиян (54 процента) полагают, что в стране сейчас нет человека, который мог бы заменить Владимира Путина на посту президента. Об этом свидетельствуют данные опроса «Левада-центра».

За два года число респондентов, которые не видят альтернативы действующему президенту, выросло в два раза. В декабре 2012 года не могли найти замены Путину 27 процентов опрошенных, в декабре 2013 года – 31 процент.

24 процента респондентов ответили, что «если потребуется, можно найти человека, который смог бы заменить Владимира Путина». Еще 10 процентов считают, что имя такого человека можно назвать уже сегодня, 13 процентов затруднились ответить на вопрос.

Отвечая на вопрос, кого бы они хотели видеть во главе государства после президентских выборов 2018 года, 55 процентов назвали фамилию действующего президента. 10 процентов предпочли бы видеть в качестве президента другого человека, продолжающего курс Путина, 18 процентов – политика, который бы «предложил другое решение проблем России».

Опрос проводился с 19 по 22 декабря. В нем приняли участие 1,6 тысячи человек из 46 регионов России. Статистическая погрешность данных этих исследований не превышает 3,4 процента.

По данным ноябрьского опроса «Левада-центра», 58 процентов респондентов выразили желание, чтобы глава государства сохранил свой пост по истечении своего президентского срока. 19 процентов не хотели бы видеть Путина на посту через 4 года, и 22 процента затруднились ответить.

ЭВРИКА!

Ботинки, вырабатывающие энергию

Немецкие ученые изобрели прибор, умещающийся в ботинке и вырабатывающий энергию при ходьбе. Эта энергия может быть использована для работы небольших электронных устройств.

Само устройство состоит из двух частей – первая часть вырабатывает энергию при соприкосновении подошвы с асфальтом, вторая – при подъеме ноги. По словам изобретателей, такой же принцип может быть использован для производства обуви с самозавязывающимися шнурками, например, для пожилых людей.

СТОП-КАДР

Свяшчэнныя ванны ў Індыі



Індыйскі праведнік уваходзіць у ваду пры ўпадзенні ракі Ганг у Бенгальскі заліў у час фестывалю “Макар Санкраіці”. У гэты дзень людзі мыюцца ў Гангу, Ямуне і іншых свяшчэнных рэках, апранаюць новую вопратку і моляцца за тых, хто пайшоў з жыцця.

ФОТООКНО

«Слоны» начинают наступление на Белый дом

На прошедших в ноябре 2014 года в США промежуточных выборах республиканцы одержали убедительную победу. «Слоны» обеспечили себе контроль над законодательной ветвью власти и начали подготовку к предстоящим 58-м выборам главы государства, запланированным на 8 ноября 2016 года.



УГОЛ ЗРЕНИЯ

Запад и Восток

Сейчас много разговоров о противоречиях между Западом и Востоком, между их системами ценностей. Но, как мне представляется, большинство из высказываемых по этому поводу суждений являются поверхностными, основанными на бытовом мышлении, на эмоциональном, идеологизированном или навязанном пропагандой восприятии этих понятий. Эти суждения часто похожи на догмы, с помощью которых пытаются прочертить удобную кому-то грань между западной и восточной цивилизациями. Но в то же время такая грань действительно существует. И возникла она гораздо раньше «русского мира», «продажной Европы», «американцев, которые хотят всех подчинить» и прочих порождений взбудораженного своими навязчивыми страхами и идеями, своими слепыми страстями разума. Так где же она, эта грань между Востоком и Западом, проходит?



Когда-то, на заре античности, человеческая цивилизация в своей истории прошла одну из точек бифуркации (точка, из которой процессы могут развиваться разнонаправленно), которую многие исследователи называют Великой бифуркацией. Эта бифуркация привела к расколу между народами, которые шли по единому, определяемому восточными цивилизациями и восточным типом государственности пути развития, и народом Греции, который избрал античный путь эволюции. Почему так случилось, что явилось толчком к таким изменениям, или, по-другому, мутациям, человеческого сознания – это отдельная тема. Здесь же стоит отметить, что новому пути эволюции человека и общества соответствовали и принципиально новые социально-политические структуры, другая экономика и прежде всего совсем другие мировоззренческие представления. Суть этих представлений коротко можно охарактеризовать как самоценность человека, равенство граждан, которые сами управляют своим государством, постоянно переизбирая весь аппарат администрации, призванный заботиться о всеобщем благе.

Такое мировоззрение, такой тип устройства общества и государства полностью противоречили тому, что было на Востоке, где правитель и созданная им вертикаль власти всегда стояли над управляемыми ими подданными, являясь как бы богоизбранными посредниками между ними и Небом, а подданные представляли собой одну общую массу лишенных индивидуальности, прав и свобод людей.

Именно это противоречие между Западом и Востоком, между западным и восточным мировоззрениями, подкорректированное временем и обстоятельствами, как мне представляется, и сегодня в наибольшей степени отражает ту цивилизационную грань, которая их разделяет. Разделяет в сознании людей, в политике государств, в той идеологии, которая этим государствам присуща.

На первый взгляд кажется, что общества и государства, основанные на восточном мировоззрении, являются более едиными, прочными и сильными, так как основываются как бы на одних взглядах, целях, задачах, на строгой централизации жизни и власти в них. Кажущаяся очевидность этого, неумение и нежелание людей искать взаимопонимание, согласие и компромиссы, стремление получить все сразу и становятся, очевидно, причиной популярности среди многих из нас такого, восточного, мировоззрения. Но, если вдуматься, основанное на насилии и подавлении других мнений единство, прочность и сила весьма относительны, так как неизбежным следствием этого является неспособность таких обществ и государств к своевременным реформам, к модернизации, их низкая конкурентоспособность в современном мире, не говоря уже об уровне жизни людей. Эти их пороки вытекают из того, что такие, основанные на диктатуре или авторитаризме, режимы не в силах использовать весь духовный и интеллектуальный потенциал людей, который и является самым большим богатством любого народа и общества. И как результат – те социальные взрывы (или революции – как кому нравится), которые с завидной периодичностью сотрясают, казалось бы, прочные еще вчера тоталитарные режимы, та культурная, политическая и экономическая отсталость, которая характеризует основанные на подавлении личности общества и государства. Не видеть и не понимать этого в современном мире думающий человек просто не может. Но многие все равно не видят и не понимают, объясняя происходящие катаклизмы происками врагов, заговорами или чем-то еще.

Кажущейся слабостью западного мировоззрения является как раз многообразие мнений, среди которых общество и государство вынуждены постоянно искать компромиссы. Но это слабость для слепца, для находящегося на низком уровне развития сознания, личного или общественного. Фактически же это и есть тот механизм, тот единственный путь, который позволяет не загонять противоречия вглубь системы, не доводить их до взрыва, до тех социальных потрясений, следствием которых является большая кровь, ненависть и вражда на многие годы, гибель или отсталость общества и государства.

А какой путь развития, какое мировоззрение ближе нам, нашему обществу?

Если оценивать прошлое, Беларусь (историческая Литва), безусловно, двигалась по западному пути развития. Великое Княжество Литовское, Русское и Жамойтское, если исходить из исторических фактов, по своей сущности являлось шляхетской республикой. В нем великий князь не мог принять ни одного важного решения без утверждения его сеймом, в нем действовал общий свод законов (Статуты ВКЛ), в нем практически все города имели Магдебургское право, в нем 3 мая 1791 года в составе конфедеративного государства с Королевством Польским была принята первая в Европе (вторая в мире после США) конституция. Более того: Возрождение, охватившее Европу в XIV–XVI веках после серой мглы средневековья, являвшееся возвращением к тем самым мировоззренческим ценностям Древней Эллады, не обошло и государство литвинов. Оно подарило нам много замечательных творений человеческого разума, человеческого духа и созидательной человеческой веры, которыми мы можем гордиться и сейчас. Жаль, что часто мы об этом забываем или этого даже не знаем. А раз так, то на каком фундаменте собираемся формировать нацию, развивать свое независимое государство? На «чарцы і скварцы», на сиюминутых меркантильных интересах и взглядах это еще никому не удалось сделать. Но, впрочем, это другая тема.

К сожалению, восточнее наших земель процесс возрождения тогда не продвинулся, и мы остались на разломе цивилизаций. Если бы это произошло, у нас сейчас было бы намного меньше проблем. Да и наши восточные соседи не разбирались бы, кто они больше – Европа или Азия, не метались бы из стороны в сторону.

Так все же какой путь развития, какая цивилизация нам ближе? Ответ на этот вопрос каждый, даже не задумываясь об этом, дает через свое мировоззрение, свои взгляды, решения и поступки. Поэтому хотелось бы пожелать всем нам способности думать и рассуждать, способности делать на основе этого разумные выводы, а не быть слепыми пленниками основанных на эмоциях и сиюминутных желаниях чувств, за которыми всегда следует убогость, нищета, отсталость и человека, и общества, и государства.

Закончить мне хочется двумя уточнениями. Первое: понятия «Запад» и «Восток» применительно к двум типам мировоззрения, о которых шла речь, сейчас являются больше данью исторической традиции, чем сегодняшними реалиями. Сегодня многие восточные страны цивилизационно, мировоззренчески являются намного более западными, чем некоторые европейские государства. И второе: часто можно слышать разговоры о каком-то третьем, или особом, пути развития общества и государства. Никто пока конкретно не сформулировал, в чем этот путь заключается. Говорят, больше в национальной специфике, в высокой духовности, в историческом (а то и божественном) предназначении народа и тому подобном. Но кто же с этим спорит? Развитие любого народа и общества, как и жизнь отдельного человека, является особенным, самобытным, неповторимым явлением. Но причину этой самобытности, на мой взгляд, нужно искать в том соотношении между двумя мировоззрениями, двумя системами ценностей, западной и восточной, которые, соединяясь в конкретном сознании, и создают его индивидуальное восприятие мира и своего места в нем. Если кому-то все это хочется назвать особым путем развития – кто ж ему запретит?

Георгий ШЕВМЕР.

ТАМ, ЗА БУГАМ

Карта вялікай сям’і

Прэзідэнт Польшчы падпісаў закон аб карце вялікай сям’і, працягваюцца грамадскія кансультацыі аб зменах у Працоўным кодэксе.

Такія карты даюць розныя льготы бацькам і дзецям з сем’яў, у якіх трое і больш дзяцей. Карты існавалі і раней, але нядаўна ўрад увёў Нацыянальную карту, а цяпер яна замацавана законам. Польскі прэзідэнт, які сам бацька пяцярых дзяцей, выступае таксама з іншымі ініцыятывамі, якія павінны павысіць нараджальнасць у Польшчы.

У Польшчы ў шматдзетных сем’ях жыве амаль 3,5 млн чалавек. Але колькасць такіх сем’яў змяншаецца. Калі некалькі дзясяткаў гадоў таму ніхто не назваў бы шматдзетнай сям’ю, у якой трое дзяцей, бо гэта была норма, то цяпер, калі ў сям’і нараджаецца трэці нашчадак, яна афіцыйна становіцца шматдзетнай. “Карта вялікай сям’і стала нацыянальнай пасля таго, як такія дакументы пачало ўводзіць усё больш муніцыпальных органаў ва ўсёй краіне”, – падкрэслівае Ірэна Вуйіцка з Канцылярыі прэзідэнта Польшчы. Нацыянальная карта прадугледжвае шэраг новых ільгот для шматдзетных сем’яў. Іх мяркуецца абмеркаваць у грамадстве.

СЛЫШАЛИ?

Выбор Грузии – европейский путь

Внешнеполитическим выбором Грузии является европейский путь, но в то же время это не означает, что он направлен против России. Об этом заявил премьер-министр Грузии Ираклий Гарибашвили на совместной пресс-конференции с премьер-министром Эстонии Таави Рыйвасом, который находился в Тбилиси с визитом.

КАДРЫ



Алім СЯЛІМАЎ:

"Што ні робіцца – да лепшага"

На гэтым тыдні новым генеральным дырэктарам футбольнага мінскага "Дынама" прызначаны двухразовы чэмпіён свету па грэка-рымскай барацьбе Алім Сялімаў.

Алім Сялімаў нарадзіўся ў Дагестане, па нацыянальнасці – лезгін. У Беларусь прыехаў у 1999 годзе. У складзе беларускай каманды двойчы станавіўся чэмпіёнам свету па грэка-рымскай барацьбе, быў удзельнікам Алімпійскіх гульняў, у 2011 годзе прызнаны лепшым спартсменам Беларусі, а ў 2012 годзе стаў заслужаным майстрам спорту.

Алім прыняў віншаванні ад "Народнай Волі" ў сувязі з прызначэннем на пасаду, але адказаць на пытанні тактычна адмовіўся: "Разумееце, тут некалькі іншая спецыфіка работы. Перш-наперш патэлефануйце ў прэс-службу клуба".

У прэс-службе распавялі, што пакуль Сялімаў устрымаецца ад каментарыяў, але ў бліжэйшы час адбудзецца прэс-канферэнцыя, на якой прадстаўнікоў СМІ пазнаёмяць і з новым галоўным трэнерам, і з новым генеральным дырэктарам.

А вось некаторыя вытрымкі з інтэрв'ю з Алімам Сялімавым, які той даў нашай газеце адносна не так даўно:

"У 2007 годзе мне прапанавалі пераехаць з Беларусі ў Азербайджан, каб выступаць за іх зборную. Прапаноўвалі каля 500 тысяч долараў. І, ведаеш, я сёння не шкадую, што тады адмовіўся. Гэта шчыра. У зборнай Беларусі я двойчы стаў чэмпіёнам свету, а хто ведае, як бы склалася ў Азербайджане. Што ні робіцца – да лепшага".

"Пасля траўмы ў 2009 годзе я не выступаў амаль два з паловай гады. Затым прайграў на чэмпіянаце краіны, была нейкая спустошанасць... Хацелася ўсё кінуць, адысці ад спорту. Сябры з Расіі казалі: "Давай да нас, у бізнес. Будзеш нармальна зарабляць". Дзякуй, што знайшліся людзі, якія дапамаглі, супакоілі. Абмеркавалі сітуацыю з жонкай Настай. Было вырашана: застаюся ў спорце!"

"Я нарадзіўся ў Дагестане, і ў Беларусі стараюся прытрымлівацца сваіх нацыянальных традыцый. Рэгулярна раблю намаз, не ўжываю алкаголь. Спіртныя напоі і наркотыкі – не для спартсменаў. Можна выпіць бакал віна, але ўсё павінна быць у меру".

"Калі жанчыне даеш шмат волі, гэта можа збіць яе з правільнага шляху. Жанчыну трэба пастаянна трымаць у строгасці. Я не кажу, што трэба рабіць з яе рабыню, але ў сям'і кожны павінен ведаць сваё месца. Жанчына – гаспадыня, павінна займацца гаспадаркай у хаце. А мужчына абавязаны прыносіць у дом грошы. І жонку не павінна хваляваць, як ён іх будзе зарабляць. Ажаніўся – значыцца, узяў на сябе абавязак утрымліваць сям'ю".

Дарэчы, гаспадар "Дынама" Юрый Чыж пракаментаваў прызначэнне Сялімава на пасаду генеральнага дырэктара клуба так: "Як спартыўны функцыянер Сялімаў мне падабаецца. Ён бачыць працэсы, можа імі кіраваць. Плюс школа барацьбы больш правільная з пазіцыі спартыўных прынцыпаў. У футболе з гэтым ёсць складанасці. А барацьба – гэта шчырасць, прыстойнасць, разуменне таго, як дасягнуць мэты".

Паглядзім, што атрымаецца з такой ракіроўкі...

Алесь СІВЫ.

ПАСЛЯ ПАДЗЕІ

Палац бліскаў. Грымелі хоры...

У Вялікім тэатры прайшоў Вялікі навагодні баль...



Сустрэча Старога Новага года ў Вялікім – штогадовая забаўка, якая дае магчымасць адчуць сябе культурным і свецкім чалавекам – мне здаецца, пачынае губляць сваю папулярнасць. Прыцягнуць новую публіку пакуль няма чым, а стары фармат балю ўжо пачаў дакучаць. Вядома ж, адыграла сваю ролю і значнае пагаршэнне пакупніцкай здольнасці людзей. У кошце квіткоў палохала вялікая колькасць нулёў: за задавальненне трэба было заплаціць у сярэднім ад мільёна да паўтара мільёна рублёў. А калі падвоіць гэтую суму (бо на балі павінна быць закаханая пара) і дадаць да яе выдаткі на набыццё святочнага ўбору і іншыя, больш дробныя, марнаванні, то канчатковая сума наогул зашкальвала.

Зрэшты, схадзіць на канцэрт якой-небудзь прывазной поп-зоркі ў Палац Рэспублікі ці "Мінск-арэну" выходзіць не танней. Але падобных прапаноў у сталіцы нямала, значна больш, чым можа пераварыць беларуская публіка. А вось аналагаў такога забаўляльнага фармату, як Вялікі навагодні баль у Вялікім тэатры, у Беларусі, бадай, няма.


Тым не менш захапленне першаадкрывальнікаў, якое наперабой выказвалі ўдзельнікі ў мінулыя гады, напэўна, скончылася. Як заўсёды, акрамя рознаўзроставых пар было нямала дзяўчат і дам без кавалераў. Кампанію ў танцах ім па традыцыі складалі курсанты ваенных ВНУ, але, на жаль, маладыя ваенныя дастаткова фармальна ставіліся да «грамадскай нагрузкі».

Адна з добрых традыцый, якую паступова фарміруе баль, – танцавальная. Калісьці жыццёва неабходнае мастацтва класічнага танца цяпер, на жаль, не запатрабавана. І дзякуючы праекту Вялікага тэатра ў людзей з'яўляецца цікавасць да гістарычнага танца і да танцавальнай культуры ў цэлым.

Адно з нядаўніх новаўвядзенняў Вялікага навагодняга балю – гэта ўручэнне Навагодняй тэатральнай прэміі ад Беларуска-швейцарскага банка «БелСвісБанк». Паводле вынікаў года генеральны партнёр праекта ўзнагароджвае вялікімі грашовымі прызамі лепшых артыстаў Вялікага тэатра. Выбіраюць пераможцаў іх калегі ў працэсе тайнага галасавання. На гэты раз творчыя калектывы тэатра прагаласавалі за Уладзіміра Пятрова (опера), Канстанціна Кузняцова (балет), Алесю Вяпрынскую (хор), Дзяніса Парэчына (аркестр) і Дзмітрыя Шэмета (кардэбалет).

Галіна БУСІНКА.

Не трэба крыўдзіцца



Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК

Вялікая навука – умець не крыўдзіцца, і вялікае майстэрства – крыўду ці ўсё тое, што здаецца крыўдай, умець ператварыць у творчасць, у той настрой, які спрыяе натхненню...

Восьмы год вывучаючы Хомкаў нораў, я шмат зрабіў вершаваных адкрыццяў, галоўнае з якіх якраз гэтае – сабакі амаль не крыўдзяцца, а калі часам і адчуваюць крыўду, то адчуванне гэтае зусім кароткае, можна сказаць, проста імгненнае!

Я ведаю, што асобныя мае чытачы ў вершах для Хомкі пазнаюць сябе – непрывабныя рысы свайго характару, як і свае несамавітыя ўчынкі.

І што?

Вядома што – злуюцца.

Мушу такім сказаць: не варта злавацца; у дакументальным творы сябе пазнае адзін, а ў мастацкім – сябе пазнаюць усе!

Канкрэтныя ж супадзенні з нейчымі характарамі, ўчынкамі і лічбамі (калі раптам здараюцца такія ў маіх вясёлых вершах) – заўсёды па-мастацку выпадковыя...

Шаноўнае спадарства!

Жадаю кожнаму ў 2015 годзе авалодаць неабходнай навукай і патрэбным майстэрствам – не крыўдзіцца!

І Хомка жадае вам таго ж.

Хомка і дзяўчаткі, якія кураць

"Ой, трымайце, упаду!
Што за неспадзеўка?
Дзеўкі кураць на хаду!
Дым над кожнай дзеўкай!" –

Нейкі закрычаў юнак...
Хомка ж растлумачыў:
"Пра дзяўчатак нашых так
Я скажу, юнача...

Ім сядзець – фігуру гнуць...
Гэта ж аксіёма,
І дзяўчатам лепш курнуць
На хаду, вядома!

Клопат маюць не адзін,
Часу мала маюць
І таму свой нікацін
На хаду ўжываюць!"

Хомка і Кіпр

Хомка дастаткова хітры –
Ці даляры, ці зайцы
Не прыхоўвае на Кіпры,
Так, як бізнес-малайцы!

Хомка – гэта не кулёмка!
Не ў Бабруйску ці ў Уздзе –
Не хавае хітры Хомка
Грошыкі свае нідзе!

Дзе хавае – там і мае
У снягі-дажджы-грамы,
І ніхто-ніхто не знае
Колькі грошай у Хамы.

Хомка і хакеісцік

Прылапушвае "зялёных"
У зялёныя гады
Несусветныя мільёны
Хакеісцік малады.

Ад здзіўлення склаўшы лапкі,
Хомка хвосцікам круць-круць:
"За гульню такія бабкі
Хакеісціку даюць?!

Не балванку на заводзе,
Не дарогу на сяло –
Шайбу запусціў па лёдзе,
І ў кішэню пацякло!

Мне ж разбагацець наўрад ці
Пашанцуе – от і склей...
Дзе сабачыя палацы?
І сабачы дзе хакей?"

Хомка і два в'етнамцы

Ляпалі ў тэатры дзверы
Оперным, – і чуўся смех...
Два в'етнамцы йшлі па скверы,
І Хама па скверы бег.

Не французы, не іспанцы,
Не мардва, не хахлама –
Два маленькія в'етнамцы
І адзін малы Хама.

Менск вакол – не Гданьск
(не Данцыг!),
Не Масква, не Кастрама –
І ўсё тыя ж два в'етнамцы,
І ўсё той адзін Хама...

Сціхнуў смех, і сціхлі дзверы –
І з в'етнамцамі двума
Добра адпачыў у скверы
Гэтым вечарам Хама!

Хомка і вядро гарэлкі

Што за дзіўная праява –
Ажно квакнула нутро?!
Пад вярбой стаіць халява...
Так, з гарэлкаю вядро!

Свіслач лёгка намывала
Нейкі бруд на берагі
І нібыта запрашала:
"Выпі, Хомка дарагі!"

Не, Хама не спакусіўся
На частунак ля ракі
І, вядома, не здзівіўся,
Што набеглі мужыкі...

Коўць, – і ляснула мікстура!
Хомка толькі хмыкнуў зло:
"І які гэта прыдурак
Пад вярбу прыпёр вядро!"

Хомка і палка

У Аматарскім у парку,
Пасярэдзіне алеі,
Хомка грыз упарта палку
Збоку помніка Казею.

Тут нічога ўжо й такога...
Палка нічыя ляжала,
І таму з канца тупога
Хомка грыз яе памалу.

Па зубах была, па іклах...
І, не трацячы настрою,
Цешыўся наш Хомка звыкла
Філасофіяй такою:

"Добра бавіцца на волі,
Маючы занятак просты...
Як тупым сябе здаволю –
За канец вазьмуся востры!"

Хомка і пісталет

"Я не паэта..."
Янка Купала

Не, не ў зброевай у лаўцы
На вітрыне пад замком –
Пісталет ляжаў на лаўцы
Ў парку... З дулам і курком,

З мушкай... Ну, вядома, тою,
На прыцэл якою браць;
І абоймай запасною
На патронаў сем, відаць;

З рукаяткай адмысловай –
Інкрустацыя са шкла! –
Словам, да стральбы гатовай
Зброя гэтая была...

Хомцы што да пісталета?
Хомка толькі скок – убок:
"Ці кіно здымаюць гэта?!
Ці падкінулі знарок?!

Ці забыў яго паэта –
Нейкі творца малады?!
Час такі – без пісталета
Ні сюды і ні туды!"

Хомка ды імператар Павел

Поўны дымнае тайны
(Скрозь нібыта пажар ззяў!),
Сон жахлівы, адчайны –
Ажно Хомка спужаўся!

Калідоры і сходы,
Залу кожную, залку
Асвятлялі паходні
У Міхайлаўскім замку.

Хомка сніў, што малойцы,
Напінаючы шыі
(Не малойцы – забойцы!),
Там цара задушылі...

А прачнуўшыся ўрэшце,
Гаўкнуў: "Смелыя падлы!
Не збаяліся звесці
Імператара Паўла!"

Хомка і артыкул у "СБ"

"Праўда вечная, аднак
У судовай зале
Суд заўсёды судзіць так,
Як суду сказалі!

Праўда чутная, як свіст
Салаўінай ночы, –
Толькі піша журналіст,
Як рэдактар хоча!

Праўда бачная, як сад
З Евай і Адамам...
Галасуе ж дэпутат
Так, як загадана!

Праўды вечна нестае,
А калі даволі,
То ўцякаюць ад яе,
Як ад горкай долі!" –

Гэтак тэзісна сябе
Хомка лапай тыкаў,
Быццам думаў у "СБ"
Напісаць артыкул.

Хомка і салдатчына

Хомка цешыўся ля хаты,
Нешта нюхаў на зямлі, –
Толькі раптам у салдаты
Хомку нашага ўзялі.

І сказаў тут бравы ротны:
"Раз да службы ты прыгодны –
Станавіся пад ружжо!
Паслужы краіне роднай,
Бо нацешыўся ты ўжо!"

Хомка хвосцікам не торгнуў:
"Што ўгаворваеце, блін!
Я ж вам не сынок парторгаў
І не пракурораў сын!

Я служыць аддана буду
Небу роднаму й зямлі,
Толькі ў месяц мне з паўпуда
Корму дайце!"
Корм далі.

Хомка і маёр

Вечар цёплы, вечар вольны,
Хор птушыных галасоў, –
І пад кошык баскетбольны
Хомка, ідучы, зайшоў.

Квакнула, здаецца, жабка
З горкай свіслацкай вады,
А з Генштаба – так, генштабка
Выйшла... Дзеўка хоць куды!

Пры мундзіры і пагонах,
Званне маючы маёр,
Выйшла служка абароны...
Хомка ўздрыгнуў і замёр!

А пасля, спакусай грэты,
Лапамі задрапаў дол:
Захацеў з маёрам гэтым
Пагуляць у баскетбол!

Хомка і 111 еўра

Шчасліваю кансерва
Са сметніка пабегла –
111 еўра
На сметніку награбла.

І прэмійку заклала
Для прэміяк ахвочых,
А іх у нас нямала –
Панькоў і панькаў творчых.

Вядома, літпраныраў
Ад сметніка не верне,
Таму і ўдзячны шчыра
За прэмійку кансерве.

А Хомка наш адцеміў
Лаўрэатам дзейным:
"Панове, так скажу я –
Як вам не засмярдзела,
Тады я вас віншую!"

Хомка і казахі

Бегучы на Камароўку,
Ля пасольства Казахстана
Проста пад акном вінтоўку
Хомка ўбачыў нечакана.

Варты не было паблізу...
Хомка з тратуара збочыў:
Пад аконным, пад карнізам –
Зброя! Ужывай хто хоча!

І не страх адзін, а страхі
З усяго набеглі свету...
Закрычаў Хама: "Казахі!
Забярыце стрэльбу гэту!

Бо дурны які (ці п'яны!)
Пастраляці будзе рады
Ля пасольства Казахстана –
То-бок, вашай амбасады!"

Выйшлі ціхія казахі,
На плячо ўзялі вінтоўку.
І назад пабеглі страхі,
А Хама – на Камароўку.

Хомка і баладнік

Без душы, мяжы і ладу,
Як з мяшка (не пакрысе!),
За баладаю баладу
Год каторы ў друк трасе.

У пачатку 90-х
Пра "Пагоню" трос, а вось
Пра дазволенае мосціць,
Нібы той саломы воз!

Лёгка ўсё ў яго і проста,
Кожны кол трапляе ў дол,
Рыфмаванаю каростай
Пакрывае ўсё наўкол.

З календарыка –
па тэмцы...
Ні нагою – у архіў...
Аббаладзіў адраджэнцаў,
На адзін капыл зляпіў!

Баладню яго імкліва (!),
Густу маючы на грам,
Тут жа ціснe наша ніва,
Каб чыталі тут і там...

Нішкам сеўшы на пасадку,
Нішкам гэтак і сядзіць...
Толькі хто памрэ – баладку
Махане, як мае быць!

"У пару прадажнай твані, –
Хомка думку стаў снаваць, –
Не глядзі, што графаманік,
А народным можа стаць!"

І пасля такой высновы
Хомка трохі памаўчаў,
Рытм змяніў сваёй прамовы
І сказаў, нібы звязаў:

"Яго дарога прагавітая –
Няма дарозе той канца, –
Ад генерала Езавітава,
Да генерала Чаргінца!"

Хомка і русіфікатар

Русіфікатар (дуб дубовы!)
Пусціў такое скавыццё:
"Для беларускае для мовы,
Як трэба, то аддам жыццё!"

І прагундосіў неяк знову:
"Я гэта шчыра гавару,
За беларускую за мову,
Як трэба, тут жа і памру!"

Хоць і дубовы, але ўскораў
З-пад сучкі нацягаць яец,
І дзе-нідзе зацягнуць хорам,
Што ён вядомы выдавец...

Русіфікатар не з Урала –
На мінскім сметніку ён рос,
І кніжак па-расійску валам
Тут наваліў аж да нябёс!

– Як будзеш паміраць за мову,
Пакліч! – сказаў Хама дуб'ю. –
Бо на агонію тваю
Глядзець я з радасцю гатовы!

Хомка і кампазітар Ігар Лучанок

Тэлефануе Лучанок,
Расказвае навіны,
А Хомка трэцца каля ног:
"Мы ў парк ісці павінны!"

Навін бясконцая рака,
Я ў ёй тану нібыта...
Цікава слухаць Лучанка –
Цудоўны кампазітар!

А Хомка просіцца: "Пайшлі..."
І Лучанку ў гуморы
Кажу: "... убачымся калі,
Тады і дагаворым!"

А Лучанок мне: "Мы жылі
З табой заўжды ў мажоры!
Ну, так – убачымся калі,
Тады і дагаворым!"

Гаворка скончана. Затым
(Як вечарам, так ранкам)
Выходзім з дому і ляцім –
Чакае прагулянка!

І ў парку грабучы пясок,
Хама сказаў адкрыта:
"І праўда, Ігар Лучанок –
Цудоўны кампазітар!"

Хомка і катамараны

Піва з рыбаю салёнай
Піў палкоўнік закаханы,
А па Свіслачы зялёнай
Тры плылі катамараны.

На адным – банкір з банкіркай,
На другім – гандляр
з гандляркай...
Хто яшчэ? Касір з касіркай
Следам шамацелі шпарка.

Хомку нашаму тым часам
Не палкоўнік закаханы,
А цікавыя адразу
Сталі тры катамараны

І шасцёра пасажыраў,
Што, як дзеці, блазнавалі
І, напружваючы шыі,
Ціснулі на ўсе педалі!

І раку не падзялілі
(Ці маліліся рэкорду?!) –
Словам, нібы коні ў мыле,
Гахнуліся морда ў морду!

І на хуткасці вялікай,
Большага не знаўшы гора,
У раку з вясёлым крыкам
Паляцелі ўсе шасцёра!

Завяршылі цырк-дарогу
У бадзёрым перапудзе...
Хомка дрыгнуў: "Дзякуй Богу,
Што рака ўсяго па грудзі!"

А палкоўнік закаханы
І не дрыгнуў, поўны півам...
Без людзей катамараны
Калыхаліся маўкліва.

Хомка і "Дом Чыжа"

На адну ці дзве хвіліны
Парк прачнуўся і заснуў;
Пад нагою шланг з машыны
Палівальнай храбуснуў.

Па-ранейшаму савецкай
Заставалася душа;
Над пасторaю Траецкай
Узвышаўся "Дом Чыжа".

А за качкай урачыста
Качаняткі тры плыло...
Байкераў-матацыклістаў,
Дзякуй Богу, не было!

З-пад галін густых, навіслых,
Што хінуліся далоў,
Хомка пазіраў на Свіслач,
Не хацеў ісці дамоў.

І, магчыма, па-савецку
Ныла Хомкава душа
І хацела, мне здаецца,
Засяліцца ў "Дом Чыжа".

Хомка і смеццягруз

Дбаючы аб чыстым свеце
(Дбайны – што ні гавары!),
Смеццягруз
грузіўся смеццем
Зранку ў Хомкавым двары.

Напінаў стальныя нервы,
Кожны гідраўлічны вус –
За кантэйнерам кантэйнер
Спаражняў той смеццягруз.

Ён стараўся, як старацца
Шчырая душа магла,
Ды асуджанасць у працы
Хомцы бачная была!

І Хама сабе заменціў
Словы гэткія: "Нябось,
Як тут ні шчыруй, а смецце
Ўсё адно пануе скрозь!

І пануе боль няўцешны
(Хомка свой панюхаў след) –
Людзі ўсё-такі дарэшты
Запаскудзяць гэты свет!"

Хомка і двор Піліпа Пестрака

У двары Піліпа Пестрака
(Бу-бу-бу і му-му-му!)
Гукі простага аркестрыка
Захапілі ўраз Хаму.

Скрыпка, бубен і гармонічак
(Ну, хіба не весялосць!),
Па-тутэйшаму гамонячы,
Польку сыпалі, як ёсць!

Тую жвавую, гасцінную,
Як тваю, так і маю,
Польку родную, адзіную,
Беларускую, сваю...

Хомка, нібы зачараваны,
Галавой ківаў няўзнак
І такімі бухнуў словамі
Пра музыкаў тых – дзівак:

"Нашу музыку галоўную
Харашэй зайграць маглі б,
Каб наліў ім кварту поўную
Знакаміты той Піліп!"

Хомка і Аздзя

Аздзя?! Што такое Аздзя?
Што за выдумка такая?
Карта незвычайнай масці?
Звер? Ці рыбіна марская?

З'яўка нейкага гратэску?!
Не, не гэта і не тое...
Аздзя – гэта месца ў Менску,
Вельмі бойкае, жывое.

Не завулак і не дворык,
А бульвар, які пад вартай, –
Азгура вядомы творык
Сцеражэ даўно бульвар той.

Што за творык? Творык гэты –
Бюст Дзяржынскага, каторы
На падмур высокі ўздзеты
Супраць ведамай канторы!

Аздзю – то-бок, гэту назву –
Хомка склаў у задуменні:
"Аз – скарочанае Азгур,
Дзя – Дзяржынскі ў скарачэнні..."

Хомка любіць там, на Аздзі,
Пастаяць, падумаць трохі
Аб сваім сабачым шчасці
І аб шчасці ўсёй эпохі.

ОЧЕВИДНОЕ–НЕВЕРОЯТНОЕ

Знаете ли вы, что...

1.Параллельные линии в космосе пересекаются.

2.Фэн-шуй изначально – искусство украшения могил.

3.При чихании все функции организма останавливаются, даже... сердце.

4.Утиное кряканье не дает эха.

5.Самое большее количество отжиманий за раз – 46.001.

6.Змея может спать в течение трех лет.

7.Длина волос на голове, отращиваемых в среднем человеком в течение жизни, – 725 километров.

8.Золото – это настолько редкий металл, что за один час в мире находят больше железа, чем за всю историю нашли золота.

9.Сердце белого кита размером с «Фольксваген-жук».

10.Сто миллионов половых актов происходит ежедневно во всем мире. Из них только 910 тысяч заканчиваются оплодотворением.

11.Лизтомания – потребность слушать музыку все время.

12.Изифалофобия – боязнь эрекции.

13.Один миллиард секунд – это примерно 37 лет.

14.Язык хамелеона вдвое длиннее его тела.

15.Майкла Джордана на втором курсе колледжа не взяли в баскетбольную команду из-за маленького роста.

16.В Кении расходы на взятки составляют одну треть домашнего бюджета.

17.Бегун способен со старта опередить гоночную машину в первые 10 метров.

18.Прыщи можно вывести смесью из размолотых таблеток любого антибиотика, аспирина и супрастина (по одной) с добавлением капли воды.

19.Колибри – единственная птица, которая может летать задом наперед.

20.Гигантские ящерицы комодо нападают даже на оленя и кабана.

21.Каждого четвертого американца показывали по телевизору.

22.Половина мужчин не моют руки после посещения туалета.

23.Если желтую канарейку кормить красным перцем, цвет ее перьев станет ярко-оранжевым.

24.Для точного поддержания баланса и аэродинамических свойств орел при выпадении пера из одного крыла теряет такое же перо из другого крыла.

25.В XVIII веке солдаты, воевавшие против армий Фридриха, принесли тараканов в Москву и Петербург. До этого тараканов там не было.

26.Чтобы расколоть орех, достаточно положить его в горячую воду на 48 часов.

27.Между плитами пирамид Хеопса невозможно просунуть лезвие.

28.В Финляндии существует чемпионат по перетаскиванию жен. Победитель получает количество пива, эквивалентное весу супруги.

29.Орлы спариваются в полете.

30.Водители убивают больше оленей, чем охотники.

ÏÎÍÅÄÅËÜÍÈÊ, 19 ЯНВАРЯ

Беларусь 1

06.00, 07.20, 08.15 «Доброе утро, Беларусь!».
07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.10 «Новости».
07.05, 08.05 «Новости экономики».
07.10, 08.10, 19.40, 23.50 «Зона Х».
08.50 Слово Митрополита Павла на праздник Крещения.
09.10 «Главный эфир».
10.05 «Клуб редакторов».
10.45 «Звездная жизнь».
11.00, 13.00, 16.00 «90 секунд».
11.40 «Невеста на заказ». Худ.фильм.
13.50, 16.05 «А снег кружит…». Сериал.
15.15, 18.40 «Новости региона».
17.35 «Белорусское «Времечко».
19.20 «Арена».
20.00 «Форум».
21.00 «Панорама».
21.45 «След». Сериал.
23.35 «Актуальное интервью».
00.25 «День спорта».
00.40 «Люди Икс: первый класс». Худ.фильм.

Беларусь 2

07.00 «Телеутро».
09.00, 10.00, 21.20 «Тэлебарометр».
09.05, 14.55 «Сашка». Сериал.
10.30 «Снежная королева». Худ.фильм.
12.00 «Встречное течение». Сериал.
13.45 «Comedy Баттл. Без границ».
15.55, 23.30 «Такси». Сериал.
16.55 Гандбол. Чемпионат мира. Беларусь=-Бразилия. Прямая трансляция.
18.50 «Универ». Сериал.
20.50 «Мозговой штурм».
21.25 «КЕНО».
21.30 «Обмани меня». Сериал.
22.25 «Случайный свидетель». Сериал.
23.25 «Хочу в телевизор!».
00.25 «Баффи – истребительница вампиров». Сериал.

Беларусь 3

07.15 "Дабраранак".
07.50 "Хачу ўсё ведаць!".
08.00, 19.00, 23.40 "Размовы пра духоўнае".
08.10, 17.10, 22.05 "Дыяблог".
08.35 "Больш грошай". Маст.фільм.
10.05 "Культпрасвет".
10.40 "Прыгоды Тома Соера і Гекльберы Фіна". Маст.фільм.
14.05 "Карусель". Маст.фільм.
15.10 "Камертон".
15.35 "Мужыкі!". Маст.фільм.
17.35 "Пярсцёнак княгіні Ганны".
19.10 "Таёжная аповесць". Маст.фільм.
20.45 "Калыханка".
21.15 "Сто песень для Беларусі".
22.30 "Размаўляем па-беларуску".
23.00 "Подых струн".

Беларусь 5

07.00, 04.10 «PRO спорт. Новости».
08.00, 11.20 Футбол. Чемпионат Англии.
09.50, 14.10, 19.40 Фристайл. Чемпионат мира.
13.10 «Фактор силы».
13.40 «Мир английской премьер-лиги».
15.35 Гандбол. Чемпионат мира. Беларусь–Словения.
17.00 Биатлон. Этап Кубка мира. Масс-старт. Мужчины.
17.50 Биатлон. Этап Кубка мира. Масс-старт. Женщины.
18.45 Футбол. Чемпионат Англии. Обзор тура.
21.05 Гандбол. Чемпионат мира. Беларусь–Бразилия.
22.35, 01.05 Баскетбол. НБА.
03.15 Европейский покерный тур.

ОНТ

06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30 «Наши новости».
06.05 «Наше утро».
09.05 «Контуры».
10.00 «Жить здорово!».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 «Новости спорта».
11.10 «Фазенда».
11.50 «Модный приговор».
13.10 «Мужское/Женское».
14.10 «Наедине со всеми».
15.10, 16.15 «Сегодня вечером».
16.50 «Давай поженимся!».
18.20 «Обратный отсчет».
19.00 «Жди меня».
20.00 «Время».
21.05 «Дело принципа».
22.15 «Отпетые мошенники». Худ.фильм.
00.10 «Ночные новости».

РТР-Беларусь

07.00 «Утро России».
10.55 «Погода на неделю».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 «Вести».
11.35 «Прямой эфир».
12.50 «Особый случай».
13.50, 16.50, 19.50, 23.20 «Новости – Беларусь».
14.30 «О самом главном».
15.40 «Еж против свастики».
16.40 «Космонавтика».
17.15 «Вся Россия».
18.00 «Сердце звезды». Сериал.
18.55 «Пока станица спит». Сериал.
20.55 «Бедные родственники». Сериал.
21.55, 23.30 «Косатка». Сериал.
00.40 «Дежурный по стране. Михаил Жванецкий».

НТВ-Беларусь

06.00 «НТВ утром».
08.30 «Дело врачей».
09.25, 10.35 «Возвращение Мухтара». Сериал.
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 «Сегодня».
11.55 «Суд присяжных».
13.15 «Суд присяжных. Окончательный вердикт».
14.15 «Едим дома».
14.50 «Обзор. Чрезвычайное происшествие».
15.10 «Прокурорская проверка».
16.20 «Улицы разбитых фонарей». Сериал.
18.05 «Говорим и показываем».
19.55 «Свет и тень маяка». Сериал.
22.40 «Анатомия дня».
23.30 «Пятницкий». Сериал.

СТВ

06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 часа».
06.10, 17.20 «Минщина».
06.20, 07.45 «Утро. Студия хорошего настроения».
07.40, 20.10, 22.55 «СТВ-спорт».
08.30 «Неделя».
09.45 «Большой завтрак».
10.40, 13.50, 16.50 «Поющие города».
10.45, 17.30 «Званый ужин».
11.40 «Семейные драмы».
12.35 «Не ври мне!». Сериал.
13.55 «Большой город».
14.30 «Звездный ринг».
15.30 «Пища богов».
16.20 «Наше дело».
16.55 «Дальние родственники».
18.30 «Скрытая угроза».
20.00 «Столичные подробности».
20.15 «Военная тайна».
23.00 «Неделя спорта».
23.30 «Странное дело».
00.20 «Джокер». Сериал.

Мир

06.00 «180 минут».
09.00 «Беларусь сегодня».
09.30, 01.50 «Тайна записной книжки». Худ.фильм.
11.00 «Ты есть…». Худ.фильм.
12.30 «За столом с вождями».
13.00, 16.00, 19.00, 23.00 «Новости».
13.20, 04.15 «Дороги Индии». Сериал.
15.05, 03.20 «В мире еды».
16.25, 00.55 «Слово за слово».
17.20 «Доктор Тырса». Сериал.
19.25 «Адель». Худ.фильм.
21.15, 23.15 «Братья детективы». Сериал.
00.05 «Новости. Главная тема».
00.25 «Наша марка».

Польскі спадарожнікавы канал

07.00, 14.35 "ПраСвет".
07.35, 15.10, 18.55 "Людскія справы".
08.05 "Два на два".
08.35 "Невядомая Беларусь: "Аблічы свабоды". Дак.фільм.
09.20, 16.40 "Mad Men. Утрапёныя-3". Серыял.
10.10 "10%, якія робяць героем". Дак. фільм.
11.40 "Эксперт".
12.05, 22.40 "Провады". Маст.фільм.
15.40 "Глядзі, Літва!". Дак.фільм.
17.25 "Час гонару". Серыял.
18.10 "Беларусы ў Польшчы".
18.30, 19.30, 20.00, 20.30 "Навіны".
18.40, 20.10 "Агляд медыяў".
18.45 "Каментарый эксперта".
19.35 "Свет".
19.50 "Агляд падзей культуры".
20.15, 20.35 "Гарачы каментарый".
20.50 "Dэвайс".
21.00 "Аб'ектыў".
21.25 "Размова".
21.50 "Асабісты капітал".
22.10 "Зоры не спяць".
01.10 "Інфармацыйна-публіцыстычны блок".

ЗАПОМНІЦЕ…

Беларускія варыянты рускай прыказкі "Черного кобеля не отмоешь добела»

Варона колькі ні мыецца, усё адно чорная.
Які чорт да лазні, такі і пасля лазні.
Паможа вароне мыла, як мерцвяку кадзіла.
Крумкачу і мыла не дапаможа.

АФІША

24, 25.01.

Нацыянальны акадэмічны тэатр Янкі Купалы

"Чорная панна Нясвіжа".

ÂÒÎÐÍÈÊ, 20 ЯНВАРЯ

Беларусь 1

06.00, 07.20, 08.15 «Доброе утро, Беларусь!».
